ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух“)
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок непр. пасьля тэксту—50 к., іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы да памеру. Гры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—27 г. бярэцца 10 проц. задатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 60, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Парткактар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Адвел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

АЎТОРАК, 4 лютага 1930 г.
№ 29 (3537)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Кампартыя Нямеччыны на шляху да заваевы большасьці пралетарыяту

НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ЗАБАРОНУ ЦЭРГІБЕЛЯУ, ПРАЛЕТАРЫЯТ ЗАВАЕУВАЕ ВУЛІЦУ

Па СССР

Ня толькі выканаць, але і перавысіць заданьне па зёбры лому

МАСКВА, 3. Ведамствы і прамысловасьць, — як высьветлілася на апошнім пасяджэньні праўленьня ўсесаюзнага аб'яднаньня «Сталь», — аднесьліся да заданьня па загатоўцы лому фармальна, пабюракратычнаму. Разьмеркаваньне кантынгэнту лому паміж трэстамі зроблена главкамі ВСНГ СССР са спазьненьнем на некалькі месяцаў і то пасьля паўторных загадаў прэзыдыуму ВСНГ СССР, у якіх абвінчалася вымова кіраўніком раду гаспадарчых органаў і меркавалася налажыць спагнаньне на вінаватых. На пасяджэньні тав. Межлаук заявіў, што ўсякія спасыланьні на перапавялічанасьць заданьняў па загатоўцы лому і іншыя «аб'ектыўныя прычыны», павінны быць катэгарычна адхілены. Трэба, ня гледзячы на асобы, моцна ўдарыць па ўсіх тых, якія адносяцца «з халадком» да важнейшай ураладаньня дырэктывы. Прамысловасьць ганебна праваліла ў першым квартале з выкананьнем заданьня па выніманьні сабекошту і недаатрымала з гэтае прычыны 275 млн. рублёў унутраных накапленьняў. Гэты прарыў павінен быць пакрыты за кошт фарсаваньня мабілізацыі унутрыпрамысловых рэсурсаў, у прыватнасьці за кошт збору лому. Трэба яшчэ цьвёрда памятаць, што самы малы прарыў у чорнай металюргіі з прычыны недаатрыманьня лому, няўхільна алаб'ецца на ўсіх іншых вучастках гаспадаркі.

Праўленьне даручыла спэцыяльнай камісіі выпрацаваць праект пастановы прэзыдыуму ВСНГ СССР, які прадбачыў-бы канкрэтныя меры для фарсаваньня загатовак лому. Павінны быць

У нагу з рабочай клясай

ЛЕНІНГРАД. (Наш. кар.). Канчаўся пахмуры ленінградзкі дзень, падаў рэдкі сьнежок, калі з усіх канцоў гораду пасунуліся калёны дэманстрантаў. Гэта была незвычайная дэманстрацыя.

Побач з сівым прафэсарам ВНУ крочыў камсамолец-ударнік, а салідныя заводзкія інжынэры замяшаліся ў шарэнгах пралетарскага студэнцтва. Сорак тысяч інжынэраў і тэхнікаў, студэнтаў і ўдарнікаў вышлі на вуліцу сказаць, што яны гатовы аддаць усе свае сілы, свае веды вялікай справе будаўніцтва сацыялізму ў нашым краі. Гэтага слова інжынэраў і тэхнікаў даўно ўжо чакала рабочая кляса, чакала вельмі цярпліва і ў гэты, славуты зараз дзень—28-га студзеня — інжынэрна - тэхнічныя работнікі Ленінграду сказалі, урэшце, гэтае слова. «Далоў лёяльнасьць — яна прыкрывае шкодніцтва», кажуць лёзунгі плякатаў.

Дэманстрацыя сказала, што ня можа быць «лёяльнага спэца», не павінна быць людзей, якія з выгалаю для сябе прадаюць свае веды. Інжынэр-удзельнік вялікае сацыялістычнае будоўлі павінен быць кроўна зацікаўлены ў посьпехах будаўніцтва, павінен быць цесна зьвязаны з рабочымі; павінен гарэць агнём барацьбы, радавацца надыходзячай перамозе.

Дэманстрацыя 28 студзеня — вялікае палітычнае здарэньне і прытым здарэньне ня толькі мясцовага значэньня. Дэманстрацыя — гэта заклік да інжынэраў і тэхнікаў усяе савецкае краіны ціснуць згуртавацца вакол трэйчнае партыі Леніна і разам з усёю рабочаю клясаю рынуцца ў апошні рашучы бой за поўнае ажыцьцяўленьне задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Значэньне дэманстрацыі падкрэсьліў у сваім выступленьні тав. Куйбышаў, які сказаў, што «дэманстрацыя — надзвычай прыемнае зьявішча, якое перарастае з маштабаў ленінградзкіх у маштаб усесаюзны».

Інжынэрна - тэхнічныя работнікі ломянь вузкія пегагагаскі каставаньні, адарванасьці ад мас, ад жыцьця. Яны выходзяць на шырокую дарогу, становяцца ў адну шэрэнгу з рабочаю клясай, нясуць свае веды, сваю энэргію на фронт сацыялістычнае будоўлі.

М. ГОХФЭЛЬД.

Адмена забароны продажу радыё апаратуры

МАСКВА, 3. У сярэдзіне студзеня па ўсім СССР быў даны тэлеграфны загад спыніць продаж важнейшае радыёапаратуры — рэпрадуктараў, тэлефонаў, акумулятараў, правадоў, шнуроў, антэннага канатніка і інш. Радыёаматары сталі масамі зварочвацца ў НКП і Т з просьбаю дазволіць ім купляць дробнага ліку апаратуры. На даных усесаюзнага Электраабʼяднаньня названы загад ужо пачаў прыносіць вялізарную шкоду.

Старшыня СНК СССР тав. Рыкаў запрапанаваў арганізацыям, якія далі гэты загад, адмяніць яго. Да разгляду пытаньня ў СНА, пашырэньне радыёапаратуры павінна адбывацца на старых падставах.

У паласе вялікіх баёў

«У Гамбургу ідуць крывавыя баі бес працоўных з паліцыяй. У горадзе будуюцца барыкады. Ёсьць забітыя і шмат параненых».

«Барыкады ў Бамбэі». «Барыкады ў Аўстраліі».

Вось некалькі вестак, якія нам тэлеграф прынес апошнімі днямі аб тых падзеях, што разгортваюцца ў капіталістычным сьвеце.

Гэтыя падзеі зьяўляюцца вельмі характэрнымі для тых клясавых баёў, у палясу якіх мы ўступілі.

Мы бачым поўны развал капіталістычнае «стабілізацыі». Гаспадарчы крызіс разгортваецца ўсё больш і больш. Нябывалым тэмпам павялічваецца беспрацоўе. Ужо зараз, ня лічачы Кітаю, Індыі, Інданэзіі, лік беспрацоўных перавышае 15 млн., што разам з сем'ямі складае 60 млн., якія пакутуюць ад голаду. У такіх краёх, як Нямеччыне, Аўстрыя, Польша няма амаль ніводнае рабочае сям'і якая-б ні была проста або ўскосна закранута беспрацоўем.

Беспрацоўе зьяўляецца ня толькі выразным паказальнікам, але магутным фактарам паскарэньня тэмпу развалу капіталістычнае стабілізацыі і абвастрэньня агульнага крызісу капіталізму.

Мы бачым агульнае абвастрэньне клясавае барацьбы ва ўсіх краёх. Барыкадныя баі зьяўляюцца грамавымі раскатамі вялікае рэвалюцыйнае буры, якая надыходзіць.

Пераможная рабочая кляса Савецкага Саюзу на чале з Камуністычнаю партыяй перайшла да апошніх рашучых баёў з капіталістычнымі элемэнтамі краю—да зьнішчэньня карэньняў капіталізму. Гэта добра адчувае сусьветны імпэрыялізм.

Пры такім становішчы зьяўляюцца зразумелымі тыя перасоўкі, якія зараз адбываюцца ў капіталістычным сьвеце ў адносінах да Савецкага Саюзу, якія павінны прыцягнуць да сябе самую вялізарную ўвагу працоўных Савецкага Саюзу і ўсяго сьвету.

Сёньня ў нумары мы друкуем весткі аб узбраеньнях да вайны супроць Савецкага Саюзу. Падрыхтоўка да гэтае вайны ўзмацняецца ва ўсіх капіталістычных краёх.

За апошні час ПАЗШ выказалі сябе ня толькі адкрытым удзельнікам антысавецкага блёку, але яны становяцца на чале гэтага блёку.

Шапёная антысавецкая кампанія разгортваецца ў Нямеччыне, Францыі.

Мы знаходзімся ў палясе вялікіх клясавых баёў. Камуністычныя партыі ідуць на чале пралетарыяту капіталістычных краёў. Гэта зьяўляецца гарантыяй таго, што пралетарыят справіцца з вялікімі задачамі, якія перад ім стаяць.

Я.

За лінію 4-га кангрэсу Прафінтэрну

БЭРЛІН, 2. У спрэчках па дакладу Мэркэра на бэрлінскім акруговым зьезьдзе рэвалюцыйнай прафапазыцыі выступаўшыя прамоўцы выказваліся за лінію, намечаную 4-м кангрэсам Прафінтэрну. Заслугоўвае ўвагі заява аднаго сацыял-дэмакратычнага прафпрацаўніка, які прызнаў сябе вінаватым у тым, што ён да гэтага часу быў членам сацыял-дэмакратычнае партыі, і змагаўся з рэвалюцыйным прафрухам.

Пасьля дакладу Мэркэра быў заслуханы дакład Браўна аб падрыхтоўцы да 5 кангрэсу Прафінтэрну. Паведамленьні пра вулічныя дэманстрацыі выклікалі ўздым зьезду. Зьезд вітае дэманстрантаў сьцеваў «Інтэрнацыянаду». Зьезд адназгодна ўхваліў рэзалюцыі аб задачах рэвалюцыйнай апазыцыі ў сувязі з падрыхтоўкаю да кангрэсу Прафінтэрну і стварэньня рэвалюцыйнага прафсаюзнага друку.

Прапанова аб спаборніцтве з Рурам была ўхвалена зьездам аднагалосна пры 3-х устрымаўшыхся.

Усімі галасамі супроць аднаго быў абраны Бэрлін - Брандэнбурскі акруговы камітэт рэвалюцыйнай прафсаюзнай апазыцыі. У зьезьдзе ўдзельнічала 618 дэлегатаў. Сярод іх камуністых—958, сацыял-дэмакратаў—5, анарха-сіндыкалістых—5 і беспартыйных—250.

РАБОЧЫЯ МАСАМІ ПАКІДАЮЦЬ РАДЫ САЦ.-ФАШЫСЦКАЙ ПАРТЫІ

БЭРЛІН. Арганізацыя нямецкай сацыял - дэмакратычнай партыі ў гаралку Ціплаў (каля Данцыгу) у поўным складзе перайшла ў кампартыю. Былыя сацыял - дэмакраты члены муніцыпалітэту склалі ў муніцыпалітэце камфракцыю

АРЫШТ КАМУНІСТЫЧНАГА РЭДАКТАРА

БЭРЛІН. У Дусэльдорфе арыштаваны па абвінавачаньні ў дзяржаўнай здрадзе адказны рэдактар камуністычнай газэты «Фрэйхэт Штыбі», які вышаў з радоў рабкоўскага руху.

Бурныя дэманстрацыі Наперакор забароне сац.-фашыстаў

БЭРЛІН. Бэрлінскі рэвалюцыйны пралетарыят, не зважаючы на забарону, дэманстраваў ва ўсіх часьцях гораду. Паліцыя ўсюды прабавала разганяць паходы дэманстрантаў пры дапамозе гумовых палак, але дэманстранты зьбіраліся зараз-жа зноў. Ня спыняліся рэвалюцыйныя выгукі. У шмат якіх мясцох камуністычныя прамоўцы выступалі перад масамі з прамовамі. У пралетарскім квартале Вэдынгу масы вырвалі арыштаваных дэманстрантаў з рук паліцыі. У Маабіце паліцыя прыпушчана была адступіць перад масамі. Нават у квартале, дзе знаходзяцца ўрадавыя ўстановы, дзе наогул ня маюць права праходзіць дэманстрацыі, рабочыя дэманстравалі

Дэманстрацыі адбыліся таксама ў Шэнэнбэргу і Шарлётэнбургу і іншых мясцох, дзе здарыліся сутычкі з паліцыяй. Шмат параненых.

«Ротэ Фане» піша: «Галодны паход нямецкага пралетарыяту распачаўся. Тое, чаго кампартыя хацела дамагчыся 1-га лютага, таго яна дамаглася іменна ў масавай дэманстрацыі пралетарскіх палкоў наперакор забароне сацыял - дэмакрата Гржэзінскага. Цяпер належыць узяць курс на выбары ў фабрычна-заводзкія камітэты. Нямецкія рабочыя рыхтуюцца да палітычнай масавай забастоўкі».

Дэманстрацыя пратэсту супроць гозрыву з СССР

НЬЮ-ЙОРК, 2. Дэтройцкія рабочыя, пад кіраўніцтвам камуністых, арганізавалі перад памяшканьнем мэксыканскага консульства дэманстрацыю пратэсту супроць разрыву Мэксыкай зносін з СССР. Паліцыя арыштавала 5 дэманстрантаў.

ЗАКАНЧЭНЬКЕ СЬЛЕДЗТВА ПА СПРАВЕ 183 У ЯПОНІІ

ТОКІЕ, 31. Як падае агэнцтва Дэмпа Цусін, папярэдняе сьледзтва на справе 183 абвінавачаных у прыналежнасьці да кампартыі, скончылася. Матар'ялы сьледзтва складаюць 50 тамоў, агулам 25.000 старонак. Суд адбудзецца ў сакавіку.

Зьезд рэвалюцыйнае прафсаюзнае апазыцыі ў Бэрліне

БЭРЛІН, 2. Зьезд рэвалюцыйнае прафсаюзнае апазыцыі Бэрлін-Брандэнбурскае акругі адчыніўся 1-га лютага ў атмасфэры вялікага напружаньня. Больш 600 дэлегатаў, выбраных на прадпрыемствах і на сходах беспрацоўных, зьявіліся ў большасьці непасрэдна з работы. Вялікая зацікаўленасьць да зьезду характарызуецца прысутнасьцю 400 рабочых у якасьці гасьцей. Зьезд таксама стаіць у цэнтры ўвагі буржуазнае грамадзкасьці ў выніку варожае кампаніі сацыял-дэмакратычнага і буржуазнага друку. Паліцыя ўся знаходзіцца ў баявой гатоўнасьці і згрупавана асабліва ў моцныя атрады ў раёне зьезду.

Заля зьезду ўпрыгожана вялізарнымі плякатамі і лёзунгамі: «За партыю Леніна», «за пралетарскую дыктатуру», «на абарону Савецкага Саюзу» і інш. Зараз-жа пасьля адкрыцьця зьезду ў ганаровы прэзыдыум выбіраюцца т. т. Сталін, Лазоўскі, Молатаў, Тэльман, а таксама зьявоўлены Марціс.

У рабочы прэзыдыум выбіраюцца Мэркэр, прадстаўнікі буйных прадпрыемстваў, прафсаюзаў, жаночых арганізацый і інш.

Згодна прапановы прэзыдыуму зьезд пасылае ЎсеЦСПС прывітальны ліст, у якім заяўляе, што рэвалюцыйная прафсаюзная апазыцыя Бэрліну ідзе на шляху заваёвы большасьці пралетарыяту. Ад імя нямецкае кампартыі зьезд вітае т. Ульбрыхт, які заяўляе, што перад зьездам стаіць задача арганізацыі рэвалюцыйнага масавага выступленьня супроць палітыкі голаду трэстаўскай буржуазіі і яе сацыял-фашысцкіх лёкаяў.

Пасьля прывітаньня прадстаўніка акругкому беспрацоўных, прадстаўніка рэвалюцыйных рабочых Рурскай вобласьці, Міжрабпому і інш. выступае Мэркэр з дакладам на тэму: «Урокі апошніх баёў і задачы рэвалюцыйнай прафсаюзнай апазыцыі».

У сваім дакладзе Мэркэр падкрэсьліў, што ўзрастаючае палярызаньне рабочых мас ставіць перад рэвалюцыйнай апазыцыяй канкрэтную задачу арганізацыі і правядзеньня барацьбы рабочае клясы супроць прадпрыемцаў, дзяржавы і сацыял-фашысцкае прафбюракратыі, з якой «левыя» сацыял-дэмакраты і брандлераўцы складаюць адзіны фронт. Асноўнай задачай апазыцыі зьяўляецца заснаваньне і ўзмацненьне адзіных баявых фронт беспрацоўных з рабочымі на прадпрыемствах. Мэркэр крытыкуе недаацэнку асобных эканамічных баёў на прадпрыемствах. Між тым вялізарныя масавыя бойкі вырастаюць іменна з такіх дробных стаўтак.

Забастоўкі пратэсту супроць расстрэлаў рабочых у Гамбургу

БЭРЛІН. У знак пратэсту супроць тэрору паліцыі ў Гамбургу спынілі працу рабочыя 30 буйных будаўніцтваў. На некаторых мэталёвых прадпрыемствах таксама абвешчана 24-гадзінная забастоўка пратэсту. У Гамбурскім порце пад адкрытым небам адбыліся мітынгі партовых рабочых.

Паведамленьні аб тым, што гамбурскі орган кампартыі забаронены паліцыяй, выклікалі вялікае абурэньне. Тысячы рабочых наваднілі вуліцы па дарозе да порту. Да вечара спэцыяльныя паліцэйскія атрады распачалі сапраўднае наступленьне супроць маніфэстантаў. Памяшканьне камітэту кампартыі занята паліцыяй. Памёр 16-гадовы рабочы, цяжка паранены ў часе нападу паліцыі на дэманстрацыю.

КАМСАМОЛЬСКІЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ Ў ПРАЗЕ

ПРАГА. У розных раёнах Прагі адбыліся камсамольскія дэманстрацыі пад лёзунгам барацьбы з ваеннай небясьпекай і за абарону СССР. Паліцыя ўсюды нападала на дэманстрантаў і затрымала 10 чалавек. Двое з іх пакінута пад вартаю, 6 аштрафавана і супроць двух паліцыя зьвяжае судовае расьсьледаваньне.

Новыя выступленьні запасных ва Францыі

ПАРЫЖ, 1. Нядаўна пад Марсэлем адбыліся новыя выступленьні запасных, якія праходзяць навучальныя зборы ў Карпянскім лягеры. Запасныя 141, 22 і 25 пяхотных палкоў выступілі з калектыўным пратестам супроць выключна дрэнных абыходжаньняў з боку афіцэраў, супроць надмернай работы і дрэннай стравы. Запасныя наладзілі рад дэманстрацый і пялі «Інтэрнацыянал».

У гарнізонах Нансі і Мэца салдаты адмовіліся ахвяраваць у фонд пабудовы помніка генэралу Фошу. У некаторых выпадках салдаты дэманстрацыйна ахвяроўвалі адзін су (паўкапейкі). Каб падкрэсьліць свой пратэст супроць гэтага «патрыятычнага» начыньня, салдаты 16-га салёнрага батальёну ў Нансі арганізавалі збор у фонд абароны СССР.

Пад знакам падрыхтоўкі вайны

Мільёны долараў на будаўніцтва крэйсароў у ПАЗШ

НЬЮ-ЁРК, 1. Вайскова-морскае камандаваньне ПАЗШ заключыла дагавор з радам буйных дзяржаўных вэрфяў на пабудову крэйсэроў. Ньюпорцкай вэрфі заказаны крэйсэр, які павінен быць зданы праз 36 месяцаў. Кошт крэйсэра—11.130.000 долараў. Крэйсэр, заказаны вэрфі Куінсі, павінен быць зданы камандаваньню ў тані-ж тэрмін. Кошт крэйсэра—10.753.000 долараў.

Камандаваньне заказала таксама авіяматку разьмерам у 12.300 тон. Кошт яе —19.000.000 амэрыканскіх долараў.

Канцэнтрацыя вайсковае прамысловасьці ў Чэхаславакіі

ПРАГА, 2. Буйныя заводы па вырабу зброі «Шкода» аб'ядналіся з заводам зброі ў Брунне і мараўска-чэскімі мэталёвымі заводамі Кольбэн. Гэта канцэнтрацыя зроблена паводле ініцыятывы ўраду і пад націскам французкіх груны заводаў зброі Шнэйдэр Крэзо. Канцэнтрацыя гэта кіруе за сабою павялічэньне вытворчасьці.

Ангельска-індыйскі ваенны флёт

ЛЁНДАН, 1. Індыйскі ўрад са згоды ангельскага ўраду пастанавіў у бліжэйшы час арганізаваць у Індыі ваенны флёт. Матросы будуць вербавацца з індусаў. Камандаваць флётам будзе контр - адмірал ангельскага ваеннага флёту.

Грэцыя рыхтуецца да вайны

Мільярды — на ўзбраеньне

ВЕНА, 30. Па ўказцы вялікіх дзяржаў, Грэцыя актыўна рыхтуецца да вайны. Паводле вестак з Атэн, грэцкае морскае кіраўніцтва камандыравала свайго прадстаўніка ў Рым для кіраўніцтва працамі па пабудове на вэрфях Дарда двух зьнішчыцеляў, якія заказаны Грэцыяй. У той-жа час яно камандыравала ў Англію другога морскага афіцэра для куплі ўзброеньня, якое прызначана для гэтых зьнішчыцеляў.

Аднак, гэты рост узбраеньня зьяўляецца недастатковым для грэцкіх імпэрыялістых. Гэтымі днямі начальнік грэцкага генэральнага штабу Масарахта апублікаваў артыкул, у якім скардзіцца, быццам, на недастаткова здавальняючае ўзбраеньне арміі. У адказ на гэты артыкул, вайсковы міністар Сафуліс даў прадстаўніком друку інтэрв'ю, у якім абвяргае сьцьвярджэньне Масарахты. Міністар заявіў, што ўрад аддае максымум увагі ўзбраеньню арміі і разгорнуму задаваленьню яе вайсковымі матар'ялямі. У Грэцыі, па яго словах, створаны спэцыяльны «фонд аховы», з якога штогодна асыгнуецца 300 млн. драхм. (драхма—каля 2,5 кап.) на набыцьцё вайсковых прылад. У той-жа час вайсковы бюджэт Грэцыі дасягае вельмі значнае сумы —2 мільярды 400 млн. драхмаў.

Бязупынны рост узбраеньняў

Імпэрыялістычныя дзяржавы, якія крывадушна разьгрываюць ролю «ахоўцаў вечнага міру», на справе працягваюць бязупынна ўзбройвацца. Аб гэтым навочна гаворыць рост вайсковых бюджэтаў у радзе краёў, спуск на ваду новых вайсковых суднаў і г. д.

Адно з першых месц у коле гэтых дзяржаў ЗАЙМАЕ ФРАНЦЫЯ. У порце Шэрбургу спушчана на ваду найбольшая ў сьвеце падводная лодка. Яе радыус дзейнасьці 10-12 тысяч міль. Экіпаж лодкі—130 чалавек. Лодка можа прабыць пад водою без перапынку каля 70 гадзін. Лодка ўзброена 4-ма 15-сантыметравымі гарматамі і мае на борце самалёт.

Нядаўна ў Брэсьце пачалася пабудова новага французкага крэйсэру, вадазьмяшчэньнем у 10 тыс. тон. Чакаюць, што новы крэйсэр зьявіцца цудам сучаснай вайсковай тэхнікі. Ён будзе ўзброены 15-ю гарматамі розных калібраў для адбіцьця вайсковых нападаў.

ПОЛЬШЧА не адстае па частцы ўзбраеньня ад Францыі. Паводле прапановы вайсковага міністэрства, польскі ўрад асыгнуе 837,2 млн. злотых на ўтрыманьне арміі, флёту і паветраных сіл у 1930-31 г. Вайсковыя выдаткі складаюць вельмі вялікую часьць бюджэту, якія дасягаюць 2.934,7 млн. злотых.

Паводле вестак нямецкага друку, у Данцыг за апошнія дні зноў прыбыў з Францыі параход «Вільля» з вялікім транспартам вайсковых матар'ялаў. У транспарце маюцца 70 танкаў, вялікі лік выбуховых матар'ялаў, зброі і г. д. Частка грузу заставецца ў порце Гдыні.

У ПАЗШ, ня гледзячы на эканамічны крызіс, асыгнаваньні на ўзбраеньне ня толькі не скарачаюцца, але, наадварот, нават растуць. Вайсковае міністэрства патрабавала ад ураду асыгнаваньня 143 млн. долараў на пабудову новых казармаў і пляцовак для вайсковых заняткаў. Калі дадаць да гэтае сумы 53 млн. долараў, якія звычайна выдаткуюцца на пабудову казармаў, дык на гэту справу будзе патрачана агулам 196 млн. долараў.

Гувэр у сваім апошнім пісьме да кангрэсу заявіў, што ПАЗШ мае самы вялікі вайсковы бюджэт у сьвеце. «У БЛІЖЭЙШЫЯ ГАДЫ,—ЗАЯВІЎ ЁН,—НА ПАБУДОВУ НОВЫХ КРЭЙСАРОЎ І ПАДВОДНЫХ ЛОДАК БУДЗЕ АСЫГНАВАНА НЯ МЕНШ 1.200 МЛН. ДОЛЯРАЎ». (ТАСС).

Ліхаманкавае ўзбраеньне Румыніі

ВЕНА, 1. Вайсковае міністэрства Румыніі асыгнавала вялікія сумы на вайсковую падрыхтоўку насельніцтва. Міністэрства прыступіла да распрацоўкі раду мерапрыемстваў у галіне вайсковага стратэгічнага будаўніцтва.

Нядаўна прадстаўнік вайсковага міністэрства зрабіў у радзе міністраў дакład аб стварэньні морскае базы румынскага флёту на Чорным моры. Адначасова вайсковае міністэрства распрацоўвае плян аднаўленьня чорнаморскае гавані Бургас. Да гэтае гавані будуць праведзены тры новых чыгуначных лініі.

Новы вайсковы бюджэт прадбачыць асыгнаваньне буйных сум на набыцьцё удасканаленага тэхнічнага абсталяваньня для арміі.

Вялікую ўвагу на ўзмацненьне авіяцыі і флёту. Флёт папаўняецца двума новымі міноносцамі — «Кароль Фэрдынанд» і «Каралева Марыя». Гэтыя міноносцы будуюцца на італьянскіх вэрфях.

Узмоцненая ўвага аддаецца пабудове шасэйных дарог, якія маюць вайсково-стратэгічнае значэньне. Урад заключае дагавор з ангельскай фірмай «Сьцюарт» на пабудову шасэйнае дарогі Бухарэст-Кранштадт і перабоўку шасэйных дарог Бухарэст-Джурджыу і Бухарэст-Буэзэу.

НОВЫЯ РАСПРАВЫ ПІЛСУДЗКАГА НАД БЕЛАРУСКІМ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧЫМ РУХАМ

Разгром сакратарыятаў беларускага рабоча-сялянскага клюбу

ФАШЫСЦКІ ДРУК ДАМАГАЕЦЦА ВЫДАЧЫ СУДУ РАБОЧА-СЯЛЯНСКІХ ДЭПУТАТАЎ

ВІЛЬНЯ, 2. (Ад наш. карспандэнта). Гэтымі днямі паліцыя зрабіла масавыя вобыскі і арышты ў Вільні і Віленшчыне.

Паліцыя арыштавала супрацоўнікаў і членаў сакратарыятаў беларускага рабоча-сялянскага клюбу.

Арыштавана таксама беларуская сэкцыя камітэту па правядзеньні выбараў на Ўсесаюзнай сялянскі зьезд.

Паводле папярэдніх даных арыштавана звыш 60 чалавек.

Паліцыя таксама зрабіла вобыск у беларускім выдавецтве «Рунь» і арыштавала кіраўніка гэтага выдавецтва.

Фашысцкі друк патрабуе выданьня беларускіх рабоча-сялянскіх паслоў—дэфэнзыве.

Фашысцкая ўлада, разам з сваімі нацыянал-фашысцкімі лёкаямі з лягэру Луцкевіча, Астроўскага і іншых, рыхтуюць новыя правакацыі ў адносінах да беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, яны падрыхтоўваюць новае выданьне працэсу рабоча-сялянскай грамады.

С.

„Справа 26“ у апэляцыйным судзе

Прыгавор першай інстанцыі зацьверджаны

ВАРШАВА, 1. У Варшаўскім апэляцыйным судзе слухалася «справа 26» па абвінавачаньні ў прыналежнасьці да кампартыі Заходняй Беларусі. Усе падсудныя былі засуджаны Беластоцкім акруговым судом да зьняволеньня ў катаржнай турме на тэрміны 15, 12, 10 і 6 год.

У свой час друк сьцьвярджаў, што на працэсе нібы была выкрыта сувязь паміж кампартыяй Заходняй Беларусі і савецкім урадам. У якасьці довадаў, указвалася на тое, што сярод падсудных знаходзіцца перакладчык наўнамоцнага прадстаўніцтва Уздан, які быў арыштаваны ў сябе на кватэры. На судзе, аднак, выявілася, што Уздан пякага дачыненьня да гэтай справы ня мае, апраўданы па суду і выпушчан. У адносінах да рэшткі падсудных прыгавор акруговага суду зацьверджаны.

Усебеларуская аргнарада пры ЦК КП(б)Б

Учора пад старшынствам т. ГАНТМАНА адкрылася ўсебеларуская аргнарада. На нараду зьявілася 29 чал. з месц. Акрамя загадчыкаў аргаддзеламіі АК у нарадзе прымаюць удзел сакратары больш буйных вытворчых парткалектываў і раёнаў суцэльнай калектывізацыі.

Нарадай зацьверджаны наступны парадак дня: 1. Аб паляпшаньні сыстэмы выпучэньня і падрыхтоўкі выпучэнцаў. 2. Аб рэарганізацыі партапарату; 3. Аб перабудовы партыйнай і масавай работы на прадпрыемствах; 4. Аб чарговых задачах партыйнай работы на вёсцы.

Учора быў заслуханы дакład т. ТАНХІЛЕВІЧА аб паляпшэньні сыстэмы выпучэньня і падрыхтоўкі выпучэнцаў.

У спрэчках па дакладу выказалася 13 чал.

Сёньня—працяг працы нарады.

4 лютага, а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні ЦК КП(б)Б

АДБУДЗЕЦЦА

НАРАДА ТАВАРЫШОЎ, ЯКІЯ АД'ЯЖДЖАЮЦЬ ДЛЯ УДЗЕЛУ

ў пасеўнай кампаніі і на пастаянную працу ў калгасы.

Аб мерапрыемствах па ўзмацненьні сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі ў раёнах суцэльнай калектывізацыі і па барацьбе з кулацтвам

Пастанова ЦВК і СНК СССР

У мэтах забесьпячэньня найбольш спрыяючых умоў для сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў Саюзу ССР пастанаўляюць:

1. Адмяніць у раёнах суцэльнае калектывізацыі дзейнасьць закону аб дазволе арэнды зямлі і аб ужываньні наёмнае працы ў індывідуальных сялянскіх гаспадарках (VII і VIII разьдзелы агульных падстаў зямлякарыстаньня і зямляўпарадкаваньня).

Выключэньні з гэтага правіла ў адносінах да серадняцкіх гаспадарак рэгулююцца раённымі выканаўчымі камітэтамі, пад кіраўніцтвам і кантролем акруговых выканаўчых камітэтаў.

2. Надаць краёвым (абласным) выканаўчым камітэтам і ўрадам аўтаномных рэспублік права ўжываць у гэтых раёнах усе неабходныя меры барацьбы з кулацтвам, аж да поўнае канфіскацыі маемасьці кулакоў і высяленьня іх з межаў асобных раёнаў і краёў (абласьцей).

Канфіскаваная маемасьць кулацкіх гаспадарак, за выключэньнем тае часткі, якая ідзе ў пагашэньне належных ад кулакоў абавязацельстваў (даўгоў) дзяржаўным і кааперацыйным органам, павінна перадавацца ў непадзельныя фонды калгасаў у якасьці ўзносу беднякоў і сераднякоў, што ўступаюць у калгас.

3. Прапанаваць урадам саюзных рэспублік у разьвіцьцё гэтае пастановы даць неабходныя паказаньні краёвым (абласным) выканаўчым камітэтам і ўрадам аўтаномных рэспублік.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР М. КАЛІНІН.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР А. І. РЫКАЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР А. ЕНУКІДЗЕ.

Масква, Крэмль
1 лютага 1930 г.

Зрываецца ініцыятыва рабочых--чыгуначнікаў

На заводзе імя Ланцуцкага няма ні аднае машыны на рамонце

Наркамзем ня ведае, колькі і якія машыны рамантаваць

1-га лютага рабочая брыгада Белбюро ЦК саюзу чыгуначнікаў праверыла, як Наркамзем БССР рыхтуецца да веснавое сяўбы, у прыватнасьці, як ідзе рамонт трактараў і сельска-гаспадарчых машын, ці перададзены гэты рамонт заводу імя Ланцуцкага і майстэрням службы шляху Зах. чыг.

Абсьледваньне выявіла наступныя факты:

Дагавор на рамонт трактараў і с.-г. машын ня быў заключаны ні з заводам імя Ланцуцкага ні з майстэрнямі службы шляху, ня гледзячы на тое, што рабочыя заводу і майстэрань праз друк абвясьцілі сябе ўдарнымі ў адносінах рамонту машын і трактараў.

Наркамзем ня ведае, як абстаіць справа з заключэньнем дагавору і перадачай машын на рамонт. Ён ня ведае і таго, колькі і якія машыны трэба рамантаваць. Толькі тры дні назад, паводле слоў інспэктара т. Сківы, былі пасланы інструкцыі, каб выявіць патрэбу ў рамонце трактараў і с.-г. машын; пакуль што на мясцох нічога ня робіцца.

Наркамзем паслаў Гомельскаму акрземаддзелу дзьве адносіны з напамінкамі аб перадачы машын у рамонт, адказу на паперкі дагэтуль няма.

Прадстаўнік Белсельгасспабу т. Навікоўскі езьдзіў у Гомель на завод імя Ланцуцкага, каб выявіць пэрспэктывы рамонту і вырабу запасных часьцей. Ён устанавіў, што завод, пры цяперашнім абсталяваньні, можа вырабляць запасныя часьці і рабіць рамонт. Чамусьці Навікоўскі не заключыў ніякага дагавору з заводам.

Брыгада лічыць, што дырэктыва партыі і ўраду аб рамонце машын выкопваецца апаратам Наркамзему і яго аддзеламі на мясцох вельмі слаба. **Ініцыятыва рабочых заводу імя Ланцуцкага і майстэрань службы шляху не скарыстоўваецца. Ніводнай машыны, ніводнага трактара ў рамонце ў майстэрнях чыгункі няма.**

Некалькі слоў аб рухавасьці апарату Наркамзему. 8-га лютага машыністцы была перадана тэрміновая паперка наконт рамонту машын, паперка была надрукавана толькі 10. Другая паперка такога-ж зьместу была аддана 23, надрукавана—24. З такою рухавасьцю апарату далёка не заедзеш.

Рабочая брыгада Белбюро чыгуначнікаў.

Белагвардзейцы рыхтуюць налёт

НА ПОЎНАМОЦНАЕ ПРАДСТАЎНІЦТВА У ПАРЫЖЫ

Буржуазны друк стварае атмасфэру для праваацыі

ПАРЫЖ, 2. Як падаюць газэты, крымінальная паліцыя праводзіць энэргічнае дазнаньне і пошукі зьнікшага Куцепава. Бульвары і белагвардзейскі друк стварае атмасфэру ганебнае праваацыі ў адносінах да поўнамоцнага прадстаўніцтва. Вядомая сваёю блізасьцю да паліцыі «Лібэртэ» піша: «Папрокі эмігрантаў на адрасу ўлады ў марудлівасьці маюць падставу. Гэтая марудлівасьць паліцыі можа даць ракавыя выпікі. У падобных выпадках паліцыя можа дзейнічаць без загаладу зьверху, бо справа ідзе аб папярэджаньні злачынства». «Лібэртэ» лічыць устаноўленай крадзеж Куцепава нарыскім аддзяленьнем ДПУ

На менскай акруговай канфэрэнцыі калгасьнікаў

Задачы суцэльнай калектывізацыі

Даклад тав. Славінскага

2-га лютага на раніцнім пасяджэньні канфэрэнцыі з вялікім дакладам аб задачах суцэльнае калектывізацыі выступіў сакратар Менакрукому КП(б)Б тав. СЛАВІНСКІ.

— Мы прыступілі да паўнешнай рэарганізацыі нашай народнай гаспадаркі, — кажа дакладчык, — да перабудовы яе на сацыялістычных падставах. Мы ставім задачу канчатковага выкарчоўваньня капіталістычных элемэнтаў з нашай гаспадаркі. І ў гэтым мы ўжо маем вялікія дасягненьні. Рост нашай народнай гаспадаркі гаворыць, што мы выканаем задачу «дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны». У 1926-27 годзе прамысловасьць СССР выпусьціла 3.700 трактароў, а ў 1929-30 годзе іх лічба будзе складаць 41.000. С.-г. машын мы рабілі ў 1926-27 годзе на 126 млн. руб., а ў 1929-30 годзе вызначана выпусьціць с.-г. машын на 380 млн. У 1926-27 годзе ўгнаеньня мы мелі 138 тысяч тон, а ў 1929-30 годзе будзе выпушчана 1.066 тысяч тон. У другім годзе пяцігодкі прамысловасьць вырока разгарнула будаўніцтва прадпрыемстваў, прызначаных для карэннае рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Шпаркім тэмпам разгортваецца будаўніцтва новых магутных заводаў с.-г. машынабудаўніцтва.

Жыцьцё паказала, што **мы расьцем значна хутчэй ад вызначаных намі пляноў. Ужо першы год пяцігодкі выразна даваў, што мы можам выканаць 5-цігадовы план у 4 гады. Нашыя дасягненьні за першы год пяцігодкі рашуча ўдарылі па малаверах і ныціках з правага ляверу, якія выступалі супроць 5-цігадовага пляну, ня верылі ў тое, што мы можам выканаць яго. Усякія хістаньні і ныверо атрымалі рашучы адпор ад самога жыцьця.** Зараз рабочыя на прадпрыемствах ужо ставяць пытаньне аб магчымасьці новага скарачэньня тэрміну выкананьня пяцігодкі.

У галіне **разьвіцьця калектывізацыі** мы маем надзвычай вялізарныя посьпехі. Калгасны рух сярод бядняцтва, батрацтва і серадняцтва разгортваецца ўсё больш і больш. Зараз пасеўная плошча БССР калектывізавана ўжо на 31 проц. Мы маем цэлы рад раёнаў, якія ўжо канчаюць суцэльную калектывізацыю.

Заходняя Эўропа, натуральна, пасвойму рэагуе на наш бурны рост. Ва ўсіх капіталістычных краёх цкаваньне Савецкага Саюзу ня спыняецца. Капіталісты прыкладаюць усе сілы, каб сарваць нашае мірнае будаўніцтва, ня даць нам магчымасьці выконваць нашыя пляны. Тое самае мы маем і ў краі. Клясавы вораг усімі спосабамі супраціўляецца мерапрыемствам партыі і савецкай улады. Кулацка-наманскія элементы гораду і вёскі, якія адчуваюць сваю блізкую пагібель, актыўна выступаюць супроць сацыялістычнага наступленьня, ня спыняючыся і перад тэрарыстычнымі актамі над асобнымі актывістымі, селькорамі, членамі сельсаветаў.

Кулацтва рашуча супраціўляецца калектывізацыі. Кулакі добра ведаюць, што, у цеснай сувязі з калектывізацыяй, партыя ставіць пытаньне аб ліквідацыі кулацтва, як клясы. Мы бязьлітасна змагаемся і будзем змагацца з актыўнымі выступленьнямі кулацтва супроць нашых мерапрыемстваў. **Мы мабілізуем усю беднату, батрацтва і серадняцтва на барацьбу з кулакамі. Батракі, беднякі і сераднякі павінны шчыльна згуртаваць свае рады вакол камуністычнае партыі і савецкай улады для барацьбы з капіталістычнымі элемэнтамі вёскі. Наша задача — у найхутчэйшы тэрмін дабіцца суцэльнае калектывізацыі сельскае гаспадаркі.** Мы ні ў якім разе не праводзім калектывізацыю шляхам адміністраваньня, шляхам прымусу. Мы грунтуемся ў нашай рабоце на шырока-разгорнуты калгасны рух сярод бядняцтва, батрацтва і серадняцтва. Батрак, бядняк і серадняк з вялікай ахвотай ідуць у калгас, выразна бачачы перавагу апошняга перад індывідуальнай гаспадаркай. Праўда, ёсьць яшчэ сярод асобных груп бядняцтва і серадняцтва хістаньні, ёсьць, напрыклад, такія разважаньні: «навошта мне старому ісьці ў калгас, няхай ідуць маладыя, а я ўжо як-небудзь дажыву гады на сваёй гаспадарцы». Такія разважаньні, зразумела, шкодныя. Мы ставім задачу ўцягненьня ў калгасы ўсяго бядняцтва і серадняцтва. Мы павінны перавыхаваць і старое пакаленьне, навучыць яго жыць пановаму, пасацыялістычнаму.

Рабочая кляса мабілізуе сваіх лепшых таварышоў для дапамогі вясковым арганізацыям у правядзеньні калектывізацыі. Мы зараз пасылаем шмат соцень таварышоў на пасталную і на часовую работу ў вёску. Дзесяткі і сотні рабочых брыгад выяжджаюць у раёны для дапамогі ў падрыхтоўцы і правядзеньні веснавое пасеўкампаніі і калектывізацыі. Рабочыя арганізуюць брыгады па рамонце с.-г. інвэнтару, зборы на закупку трактараў, угнаеньня, машын і г. д.

Мы павінны мабілізаваць усю сваю ўвагу вакол пытаньняў пасеўнае кампаніі. Калгасы павінны быць прыкладамі гаспадараньня. **Трэба арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва паміж асобнымі калгасамі на лепшае правядзеньне пасеўнае кампаніі.** Трэба мабілізаваць думку ўсяго батрацка-бядняцка-серадняцкае грамадзкасьці вакол гэтае важнейшае палітычнае кампаніі. Ад таго, як мы правядзем гэтую кампанію, будзе залежаць наступны посьпех нашага будаўніцтва, далейшае разгортваньне суцэльнае калектывізацыі. Лёзунг партыі «дагнаць і перагнаць» капіталістычныя краі, мы павінны як-бы там ні стала выканаць. Можна з упэўненасьцю сказаць, што мы выканаем яго з посьпехам.

Спрэчкі па дакладу тав. Славінскага

Па дакладу тав. Славінскага разгарнуліся шырокія спрэчкі. Выказаліся 24 дэлегаты. Запісалася для выступленьня 31 чалавек.

Тав. **Бабчынскі** (Капыльскі раён) кажа, што ў раёне калгасамі ахоплена 80 проц. усёй плошчы. Некаторыя калгасы займаюць па некалькі тысяч гэкт. Напрыклад, калгас імя тав. Варашылава мае плошчу ў 8.000 гэкт. Вялікі рост калгаснага руху выклікае шалёнае супраціўленьне кулацкіх элемэнтаў. Мы ведзем факты падпалу калгаснай маемасьці, забойствы праз вокны нашых актывістых і г. д. У Капыльскім раёне суцэльная калектывізацыя раскулачана ужо 300 гаспадарак.

Мы прыступілі, кажа ў заключэньне тав. Бабчынскі, да арганізацыі ў раёне машынна-конная станцыі.

Тав. **Гантман** (калгас «Прагрэс» Сьвятлянскі раён) завастрае ўвагу канфэрэнцыі на некаторых памылках АЗЕТ'у пры арганізацыі яўрэйскіх калгасаў. Па думцы т. Гантмана, мы зараз ня маем патрэбы ў арганізацыі нацыянальных калгасаў. Нам патрэбны інтэрнацыянальныя калгасы.

Тав. **Савіцкі** (Вягомльскі раён) расказвае аб ходзе калектывізацыі ў раёне. У 1928 годзе было толькі 9 калгасаў, якія складалі 2 проц. плошчы раёну. На цяперашні дзень мы ўжо маем 40 калгасаў, якія займаюць каля 50 проц. усёй плошчы Вягомльскага раёну. Ёсьць шмат фактаў упартай барацьбы кулацтва супроць калектывізацыі. У пагранічнай вёсцы Пустасельні баптысты і царкоўнікі арганізавалі свой «калгас». Зразумела, што гэты «калгас» накладаў усе сілы, каб сарваць калектывізацыю.

Марыні Хадасэвіч (мястэчка Зэмбіна, Барысаўскага раёну)—ужо 60 год. Яна заяўляе канфэрэнцыі, што толькі зараз яна ўбачыла перад сабой сапраўдны шлях да лепшага жыцьця. Да шостай гадавіны сьмерці Леніна 60-цігадовая Хадасэвіч уступіла ў рады КП(б)Б. На Барысаўскай раённай канфэрэнцыі яна здала залаты гарсьцёнак у фонд калектывізацыі. Зараз па канфэрэнцыі калгасьнікаў яна заяўляе, што ўносіць срэбны рубель у фонд калектывізацыі. Яна выклікае ўсіх жанчын пасьледаваць яе прыкладу.

Аб памылках АЗЕТ'у пры ўпарадкаваньні яўрэйскага працоўнага насельніцтва на зямлі гаворыць таксама ў сваім выступленьні старшыня камуны камсамолец (Астрашыцка-Гарадзецкі раён) тав. **Галадушка.** Некаторыя калгасы засьмечаны чужым элемэнтам. Нават у кіраўніцтва калгасаў пралазілі былыя гандляры. Неабходна,—гаворыць т. Галадушка,—ачысьціцца ў бліжэйшы час ад гэтых элемэнтаў.

Тав. **Хайкоў** (Пухавіцкі раён) завастрае ўвагу канфэрэнцыі на неабходнасьці паладзіць правільны і дакладны ўлік у калгасах. Калгасы ня маюць рахункавадаў. Трэба сур'ёзна падумаць аб стварэньні кадраў рахункоўных працаўнікоў для работы ў калгасах.

Па дакладу т. Славінскага выказаліся яшчэ многія таварышы. У заключным слове тав. Славінскі адказваў на ўсе закранутыя ў спрэчках пытаньні.

Дзеньнік канфэрэнцыі

Учора на раніцнім пасяджэньні былі заслуханы спрэчкі па дакладу т. Каранеўскага аб веснавой пасеўнай кампаніі. Запісаліся 22 таварышы, выказалася 15 дэлегатаў.

У спрэчках выступіў таксама старшыня Менакркалгассаюзу тав. Сьцяпанаў.

На раніцнім пасяджэньні канфэрэнцыя заслухала і даклад т. Цынкова аб арганізацыі гаспадаркі, працы і аплаты ў калгасах. Па дакладу выказалася каля 17 чалавек.

***

Вечарам дэлегаты канфэрэнцыі выпрацоўвалі рэзалюцыі па дакладах т. т. Славінскага, Каранеўскага і Цынкова.

На вячэрнім пасяджэньні была заслухана інфармацыя аб дагаворы сацыялістычнага спаборніцтва ў калгасах.

Учора вечарам закончыла сваю работу канфэрэнцыя калгасьнікаў Менчыны.

Разгарнуць работу па пашырэньні падпіскі на часопісь „Партыйны работнік"

Шпаркі тэмп сацыялістычнага будаўніцтва, паступовае наступленьне сацыялістычных элемэнтаў па ўсім фронце, рост творчае актыўнасьці і энтузіязму рабочае клясы, калгаснікаў і бядняка-серадняцкіх мас вёскі, — патрабуюць ад партыйных арганізацый, кожнага актывістага пановаму ставіць партыйна пасавую работу. Паўстае пытаньне аб зьмене формы і мэтадаў партыйнае работы, якія-б не адставалі ад гэтых тэмпаў, спрыялі-б яшчэ большаму ўзьнёсьцю пралетарскага энтузіязму на творчае будаўніцтва сацыялізму.

Вялікую ролю ў справе дапамогі практычнаму ажыцьцяўленьню гэтых задач адыгрывае часопісь «Партыйны работнік», якая, абагульваючы практыку партыйнае работы, на добрых прыкладах і новых формах і мэтадах паказвае, як трэба працаваць з пункту погляду агульных палітычных задач, адначасова паказвае дрэнныя бакі работы, рэзка крытыкуючы іх.

Даючы кіраўнічыя паказаньні аб мэтадах і формах партработы, зьяўляючыся арганізатарам і кіраўніком партыйнае думкі ў галінах партыйнага будаўніцтва, «Партыйны работнік» на працягу бліжэйшага часу асьвятліць пытаньні кіраўніцтва партыйных арганізацый на прадпрыемствах, кіраўніцтва вясковых арганізацый калектывізацыяй, пытаньні перабудовы работы прафсаюзаў, пытаньні выкананьня прамфінпляну і г. д.

Апрача гэтага «Партыйны работнік» робіць агляд партработы па асобных галінах: правядзеньне нацпалітыкі пізавымі партарганізацыямі, работа сярод жанчын, кіраўніцтва камсамолам, аб падрыхтоўцы кадраў, ходзе вылучэньня і разгортваньні самакрытыкі. Як асобнае пытаньне асьвятляць практыку барацьбы з нацыянал-апартунізмам у партыі, барацьбу з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, шавінізмам усіх колераў, пытаньні барацьбы з правай небясьпекай і левымі загібамі, практыка барацьбы на ідэалёгічным і культурным фронце і г. д.

Усё гэта дае поўную магчымасьць для ўсіх партарганізацый, для кожнага актывістага — партыйца і камсамольца азнаёміцца з добрымі прыкладамі партработы і перанесьці практыку добрай работы туды, дзе яшчэ яна была невядома.

Разам з гэтым партыйныя арганізацыі павінны памятаць, што часопісь здолее з посьпехам выканаць усе задачы, што стаяць перад «Партыйным работнікам», пры ўмове, калі вакол яго будуць згуртаваны пырокія колы супрацоўнікаў з таварышоў, якія працуюць на партыйнай рабоце, савецкай, у калгасах, на прадпрыемствах, на вёсцы і г. д., пры ўмове, калі падтрымае ўся партыйная арганізацыя. Падтрыманьне гэтае павінна выявіцца ў тым, каб часопісь выпісвалі, чыталі, пісалі ў яе, былі з ёю моцна зьвязаны.

Райкомы і партыйныя ячэйкі павінны аддаць максымум увагі пытаньням распаўсюджаньня часопісі, разгарнуць у ячэйках шырокую растлумачальную работу аб значэньні неабходнасьці часопісі для кожнага партыйца-актывістага. **Камсамольскія арганізацыі таксама павінны прыняць удзел у гэтай справе, разгарнуць работу на прасоўваньні «Партыйнага работніка» сярод актыву камсамолу.**

Работа павінна даць такія вынікі, каб кожная гарадзкая, вясковая партыйная, камсамольская ячэйка, кожны агітатар, прапагандысты, групавы, цэхавы і зьвяковы арганізатар, кожны партыйны і камсамольскі актывісты выпісвалі часопісь «Партыйны работнік».

З свайго боку рэдакцыя часопісі прымае ўсе меры да таго, каб шчыльна зьвязацца з партыйнымі і камсамольскімі арганізацыямі з тым, каб «Партыйны работнік» быў сапраўдным дапаможнікам кожнага актывістага, кожнай ячэйкі.

П.

Партыйнае будаўніцтва

НАПРУЖЫМ БАЛЬШАВІЦКУЮ ВОЛЮ У БАРАЦЬБЕ ЗА ПРАМФІНПЛЯН

Баявая і неадкладная задача парткіраўніцтва--паскорыць перабудову партыйнай і масавай работы на прадпрыемствах, дабіцца, каб кожны камуністы паказваў узор ударных, рэвалюцыйных тэмпаў работы

Па-бальшавіцку выправіць прарывы

Сур'ёзныя гаспадарчыя прарывы ў першым квартале другога году пяцігодкі, дапушчаныя на цэлым радзе заводаў і фабрык, з усёй выразнасьцю сьведчаць аб тым, што частка вытворчых партарганізацый яшчэ ня стала арганізатарам барацьбы за стопроцантнае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. Недавыкананьне асноўных вытворчых паказальнікаў у першым квартале сыгналізуе аб тым, што некаторыя вытворчыя арганізацыі КП(б)Б яшчэ зусім не перабудавалі партыйнай і масавай работы на прадпрыемствах у адпаведнасьці з новымі тэмпамі і задачамі. Мы яшчэ маем на цэлым радзе заводаў і фабрык такое становішча, калі значная частка камуністых ня прымае ўдзелу ў сацыялістычным спаборніцтве і ўдарным руху. Так, напрыклад, частка (праўда, зусім нязначная) камуністых фабрыкі **«Вэзуві» (Гомель)** пя толькі ня прымае ўдзелу ў сацыялістычным спаборніцтве, ня толькі плянецца ў хвасьце, але і адкрыта нарушае працоўную дысцыпліну, нядбайна і недапушчальна адносіцца да варштатаў і машын і займаецца сымуляцыяй. З 205 адміністрацыйных спагаднічаў, выпесеных кіраўніцтвам ф-кі «Вэзуві» ў адносінах да асобных рабочых, 20 спагаднічаў прыпадае на членаў і кандыдатаў партыі. Між тым, гэтыя спагаднічы вынесены за сымуляцыю, злачынае псаваньне матар'ялаў і фабрыкатаў і інш. ганебныя ўчынкі. Гэта гаворыць аб тым, што кіраўніцтва партыйнага калектыву фабрыкі «Вэзуві» незлавальняюча і нерашуча рэагуе на хвасьцішчыя, на сутнасьці антыпартыйныя недапушчальныя наводзіны асобных камуністых на вытворчасьці. Мы адзначаем, што партыйны калектыў яшчэ ня здолеў перабудаваць партыйнай і масавай прапагандысцкай работы на прадпрыемстве ў адпаведнасьці з новымі задачамі. Уся партыйная і масавая работа рэдэцца на-старынцы. Палітычнае клясавае выхаваньне рабочае масы не пасталена, як належыць. Гэтае адставаньне ад новых тэмпаў і задач, гэта марудныасьць і павольнасьць у перабудове форм і мэтадаў работы зьяўляецца аспэўнай прычынай недавыкананьня прамфінпляну на фабрыцы Баявая дырэктыва аб зьніжэньні сабекошту не ажыцьцёўлена. Наадварот, сабекошт на фабрыцы «Вэзуві» трывожна павялічваецца. Ясна, што кіраўніцтва фабрычнай партарганізацыі павінна быць безад кладна ўзмоцнена Трэба, каб партарганізацыя сапраўды пабальшавіцку выправіла дапушчаныя глыбокія прарывы, абвясьціла бязьлітасную барацьбу камуністым-«хвосьцікам» і ўзялася за энэргічную і паскораную перабудову сваёй работы з тым, каб дабіцца стопроцантнага выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну. У гэтым напрамку фабрычнай партарганізацыі трэба узяць прыклад з партыйных калектываў ф-кі **«Чырвоная Бярэзіна»** (Нова-Барысай і заводу **«Чырвоны Мэталісты»** (Віцебск).

Камуністы «Чырвонай Бярэзіны» пасьля сыгналаў «Зьвязды» аб ганебных прарывах на ф-цы па-бальшавіцку прызналі дапушчаныя памылкі і мабілізавалі рабочую масу на барацьбу за прамфінплян. Фабрыка па ініцыятыве бюро партыйнага калектыву абвясьціла сябе ўдарнай. Партыйная арганізацыя заводу «Чырвоны Мэталісты» пасьля сур'ёзнейшых правалаў у сваёй рабоце па кіраўніцтве сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарным рухам, па арганізацыі барацьбы за прамфінплян, рашуча ўзялася за выпраўленьне прарываў і памылак. І зараз мы бачым, як завод, які недавышусьціў у першым квартале дзесяткі тысяч с.-г. машын, зноў выходзіць у першыя рады прадпрыемстваў. Бясспрэчна, гэтага яшчэ мала, камуністым «Чырвонага Мэталістага» і «Чырвонай Бярэзіны» яшчэ трэба будзе ўпар та і настойліва змагацца за перавыкананьне кантрольных лічбаў прамфінпляну, але энтузіязм і энэргія, з якімі партыйны калектыў і беспартыйныя рабочыя і работніцы ўступілі ў барацьбу за прамфінплян, зьяўляюцца лепшай зарукай выкананьня пастаўленых задач. На гэтым, вразумела, нельга супакойвацца, нельга разьлічваць толькі на адзін энтузіязм. Партарганізацыям трэба шпаркім тэмпам перабудаваць сваю работу, пасьлядоўна ўзмацняючы сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарны рух і вядучы бязьлітасную і жорсткую барацьбу з тымі, хто плянецца ў хвасьце і зьяўляецца дэзэртырам з працоўнага фронту.

Для таго, каб стаць сапраўднымі арганізатарамі барацьбы за прамфінплян, вытворчым партарганізацыям трэба забясьпечыць належную пастаноўку масавай работы на прадпрыемствах, умацненьне работы грамадзкіх і прафэсыянальных арганізацый на заводах і фабрыках і г. д.

Мы зварачаем увагу яшчэ на тое, што вельмі часта даны партыен. уступіўшы ў сацыялістычнае спаборніцтва і абвясьціўшы сябе ўдарнікам, на практыцы ня выконвае прынятых на сябе абавязацельстваў. У гэтых адносінах нельга не адзначыць некаторых фактаў з практыкі партыйнага калектыву «Палесдруку» (Гомель). Усе 100 проц. камуністых гэтага прадпрыемства прымаюць удзел у сацыялістычным спаборніцтве. Адначасна гледзячы на разгорнутае сацыялістычнае спаборніцтва, «Палесдрук» скончыў першы квартал з трывожнымі і небясьпечнымі паказальнікамі. Вытворчая праграма на прадпрыемстве недавыканана на 18 проц. Прычыны недавыкананьня прамфінпляну ляжаць ня толькі ў слабасьці масавай і прафэсыянальнай работы на прадпрыемстве. Гэта яшчэ тлумачыцца тым, што некаторыя члены партыі, як і асобныя беспартыйныя рабочыя, на практыцы ня выканалі абавязацельстваў, прынятых па гаспадарча-палітычным дагаворы.

Партарганізацыям на такіх фактах трэба сваячасова рэагаваць. Трэба дабіцца такога становішча, каб кожны ўдарнік на справе зьяўляўся ўдарнікам сацыялістычнага спаборніцтва. Работа кожнага камуністага на вытворчасьці будзе адэньвацца перш за ўсё па тым, наколькі ён паказаў узор ударных рэвалюцыйных тэмпаў работы і камуністычных адносін да працы, наколькі ён на справе зьяўляецца ўдарнікам сацыялістычнага спаборніцтва.

Хвасьцістым, рвачом, прагульшчыкам павінна быць абвешчана самая суровая і бязьлітасная барацьба. Побач з гэтым трэба сваячасова выкрываць камуністых, якія не вядуць гэтай барацьбы і прымірэнча і прыхільна адносяцца да тых, хто зрывае выкананьне прамфінпляну.

Шпаркім тэмпам перабудоўваючы сваю работу на прадпрыемствах, вытворчыя партарганізацыі павінны стаць арганізатарамі барацьбы за прамфінплян.

Г. Т.

Не здаваць пазыцый

Фабрыка **«Гэрой Працы»** (Добрушскі раён, Гомельшчына) у першым квартале выканала прамфінплян толькі на 68 проц. Сабекошт зьніжаны на 5.5% замест 12 проц., прадугледжаных прамфінпляном. Дырэктыва аб павялічэньні прадукцыйнасьці працы выканана толькі на 50 проц.

У чым заключаюцца прычыны гэтых трывожных і небясьпечных прарываў. Кіраўніцтва фабрыкі імкнецца апраўдаць недавыкананьне асноўных вытворчых паказальнікаў «аб'ектыўнымі» і тэхнічнымі прычынамі. Партыйныя і прафэсыянальныя кіраўнікі фабрыкі таксама спасылаюцца на гэтыя «аб'ектыўныя» прычыны і ўмовы. Аднак, цэлы рад фактаў выразна сьведчыць аб тым, што партыйнае кіраўніцтва на фабрыцы ня здолела своячасова мабілізаваць радавую партыйную масу, беспартыйных рабочых і работніц на ўпартую і пасьлядоўную барацьбу за поўнае выкананьне прамфінпляну.

Ні адна з выразных зусім ясных дырэктыў раённага камітэту партыі аб узмацненьні кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарным рухам і перабудове форм і мэтадаў партыйнай і масавай работы ў адпаведнасьці з новымі задачамі, у цэхавых ячэйках не ажыцьцёўлена на практыцы.

Кіраўніцтва ўдарнымі брыгадамі пастаўлена зусім неадэкватнаяюча. З гэтае прычыны адзначаны факты развалу ўдарных брыгад. Частка камуністых зусім ня выконвае прынятых на сябе абавязацельстваў па сацыялістычным дагаворы.

На заводзе пагражаюча аслабла працоўная дысцыпліна. Колькасьць прагулаў у сьнежні месяцы ў параўнаньні з лістападам павялічылася амаль у тры разы. Асобныя рабочыя мэханічнага цэху недапушчальна адносяцца да мацыны і варштатаў. Такое-ж самае зьявішча мае месца і ў папіровым цэху.

Партарганізацыя фабрыкі «Гэрой Працы» павінна безадкладна і рашуча разгарнуць барацьбу за поўнае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. Трэба з усёй рашучасьцю ўдарыць па камуністых, якія плятуцца ў хвасьце, ня прымаюць удзелу ў сацыялістычным спаборніцтве і фактычна зрываюць прамфінплян. Партарганізацыя павінна ўдарнымі тэмпамі спрэавіць дапушчаныя сур'ёзныя прарывы.

Р.

БУДАЎНІЧЫ СЭЗОН МОЖА ЗАХАПІЦЬ НАС ЗЬНЯНАЦКУ

Дагэтуль ня складзены пляны і чарцяжы на рад будаўнічых работ

Павольная падрыхтоўка пагражае сваячасоваму пачатку сэзону

Якасьць будаўнічых матар'ялаў дрэнная

Белстрамтрэст ня выконвае дырэктыў аб паляпшэньні якасьці

Час зьвярнуць увагу на якасьць будаўнічых работ на якасьць будаўнічых матар'ялаў.

У часе абсьледаньня будаўніцтва, РСІ і камітэт будаўніцтва пры СНК знайшлі, што пры набудове сьцен часта парушаюцца будаўнічыя правілы (цэгла перад кладкай ня змочвалася, раствор слаба перамешваўся, граві для бэтонных работ дрэнна прамываўся і г. д.). **Якасьць цэглы, што выпускаецца нашымі заводамі, нязважная.** Гліна на цагельных сартуецца кепска, фармоўка цэглы робіцца ў няправільных кромках, разьмер не заўсёды адпавядае стандарту, а сама цэгла пасьля апальваньня ў гофманскай печы выходзіць з вельмі няроўнаю паверхнаю і няроўна апалянаю.

Дрэнная цэгла трапляецца амаль на ўсіх заводах у вялікім процанце. У Магілеве, напрыклад, камісія, якая рабіла абсьледваньне, забракавала адзін мільён цэглы і знайшло, што гэта цэгла можа быць скарыстана выключна на аднапавярховыя будынкі.

Рацыяналізатарскія органы амаль на ўсіх заводах вырабу будаўнічых матар'ялаў не працуюць. Усе гэтыя недахопы трэба тлумачыць дрэнным тэхнічным наглядам з боку Страмтрэсту.

Камітэт будаўніцтва прапанаваў Белстрамтрэсту у двухмесячны тэрмін падаць у камітэт праект канкрэтных мерапрыемстваў для паляпшэньня якасьці цэглы. Страмтрэст падаў не праект, а нейкія недаробленыя тэзісы, якія будаўнічаму камітэту прыпалося адхіліць.

Апрача таго, прапанавана Страмтрэсту ў месячны тэрмін распрацаваць пытаньне аб **увядзеньні дыфэрэнцыяваных цэн па гатунках цэглы.** Тэрміны, якія вызначаны для гэтага, ужо праходзяць, а будаўнічы сэзон набліжаецца. Страмтрэсту трэба падцягнуцца, каб з пачатку новага будаўнічага сэзону палепшыць якасьць цэглы.

Амаль на ўсіх набудовах **ужываецца сырая драўніна.** Пастанова ЭКАНА «Пра мерапрыемствы па барацьбе з дамавым грыбком», апублікаваная ў студзені 1928 году, **да гэтага часу ня выканана.** Арганізацыя сушыльніц да гэтага часу праводзіцца надзвычайна слаба.

Апрача таго, было прапанавана ўсім арганізацыям і ўстановам, якія загатаўляюць лясны будаўнічы матар'ял і ставяць будынкі, ужываць, пачынаючы з будаўнічага сэзону 1928-29 г., выключна сухі лясны матар'ял у захованых мясцох будынкаў (для балак, абвязак, міжпавярховых перакрыцьцяў і інш.), але-ж абсьледваньне РСІ і будаўнічага камітэту паказала, што і гэта прапанова не выканана.

М. ШЫРКО.

З 40 праектаў гатова толькі 14

Што перашкаджае падрыхтоўцы да будаўнічага сэзону?

На працягу 2-х вечароў адкрыты сход парткалектыву Белдзяржбуду абмяркоўваў пытаньне аб выніках мінулага і падрыхтоўцы да будучага будаўнічага сэзону. У сваім дакладзе дырэктар Белдзяржбуду т. **Васэрман** адзначыў, што ў мінулым годзе Белдзяржбуд правёў вялізную вытворчую работу. Прамфінплян выкананы трэстам з вялікім перавышэньнем. Замест вызначаных 4.500 тыс. рублёў, выдана на будаўніцтва каля 17 мільёнаў руб.

Горш абстаіць справа з **выкананьнем дырэктывы аб патаненьні сабекошту.** Дырэктыва ня выканана. Замест праектаваных 15 проц., сабекошт зьніжаны толькі на 8 проц.

Віна тут ва многім будуючых арганізацый, якія вельмі позна падалі праекты і рабочыя чарцяжы. У гэтым годзе зноў паўстае небясьпечна невыкананьне дырэктывы з-за гэтай-жа прычыны. **Трэба будаваць 40 новых аб'ектаў, на сёньняшні дзень падана толькі 14 праектаў.**

Спрэчкі па дакладу т. Васэрмана выявілі дрэнную падрыхтоўку да будаўнічага сэзону. У жніўні вызначана пакрыць дом ураду, а чарцяжоў пабудовы ўсё яшчэ няма. На 21 будаўнічым пункце гор. Менску не хапае матар'ялу, ён не падвозіцца. Не хапае больш за 9 мільёнаў штук цаглін.

Наглядаецца шмат непаразумкаў на асобных пабудовах. Кваліфікаваныя рабочыя 8-га разраду выконваюць некваліфікаваную работу. 2 інжынэры, занятыя праектаваньнем дому ўраду, выяжджаюць у Маскву на Кастрычніцкія сьвяты і гуляюць там 7 дзён.

Асобныя камуністыя ня прымаюць належнага ўдзелу ў рабоце ўдарных брыгад і сацспаборніцтва на набудовах. Быў выпадак, калі член партыі адмовіўся ўступіць ва ўдарную брыгаду, заяўляючы, што «мы ўсе ўдарнікі».

Работа вытворчых камісій і нарад праходзіць бяз удзелу інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу.

Значна кульгае якасьць работы: многія будынкі праз кароткі тэрмін далі шчыліны, у новых падлогах паміж дошкамі—вялікія шпарыны. На пабудову дому ўраду дастаўляецца цэгла зусім дрэнная якасьці,—такое цэгла дастаўлена ўжо 2 мільёны штук. Прадукцыю гэту дае завод № 1.

Некаторыя пабудовы ўжо больш за год знаходзяцца ў эксплёатацыі, а па іх яшчэ дагэтуль ня зроблена разьліку, яны фактычна ня зданы гаспадарчым арганізацыям, і з гаспадарнікаў належаць вялікія сумы грошай—Камунбанк вінен 98 тыс. рублёў, фармзавод — 70 тыс.

Будаўніцтва ідзе па старых мэтадах, зусім ня ўзяты курс на калектывізацыю, укараненьне новага быту ў рабочых кватэрах.

Наглядаецца драпежніцкія адносіны да кашэтоўнага дэфіцытнага матар'ялу. Старыя добрыя дошкі ражуцца на дровы, адкілы дэфіцытнага жалеза не скарыстоўваюцца і г. д.

Наогул, трэба адзначыць, што сход шмат дапамог выяўленьню тых хібаў, якія перашкаджаюць нашаму будаўніцтву і затрымліваюць падрыхтоўку да новага будаўнічага сэзону.

Г. ДОРСКІ.

Віцебскае аддзяленьне Белдзяржбуду не падрыхтавана да сэзону

Гаспадарчыя арганізацыі ня скалі праектаў будаўніцтва

Калі ў мінулыя гады мы мелі ў Віцебску рад памылак і промахаў у падрыхтоўцы да будаўнічага сэзону, дык у гэтым годзе мы наглядаем поўную бязьдзейнасьць і непадрыхтаванасьць да надыходзячага будаўніцтва.

Прадпрыемствы, якія вызначаюць праводзіць будаўніцтва, як шпэйная фабрыка, гэрбарня, пічацінны камбінат, элеватар, дагэтуль ня прыслалі праектаў папярэдніх каштарысаў і чарцяжоў. Будаўнічыя вучасткі не замацаваны, і пытаньне аб адвядзеньні вучасткаў пад будаўніцтва зусім ня вырашана.

З прычыны гэтага Віцебскае аддзяленьне Белдзяржбуду не праводзіць і ня можа весьці ніякай падрыхтоўкі.

Пад пагрозай зрыву—выкананьне дырэктывы ўраду аб зьніжэньні сабекошту будаўніцтва на 14 проц., бо, ня ведаючы разьмераў і кошту будаўніцтва, Белдзяржбуд ня можа прапрацаваць пытаньня аб мэханізацыі і рацыяналізацыі будаўнічых работ.

Калі ня будуць прысланы неабходныя каштарысы, праекты і чарцяжы, то можна быць упэўненым, што праекцыі зьніжэньне сабекошту ня ўдасца.

Зусім ня вырашаны пытаньні аб патрэбнай колькасьці кваліфікаванай рабочай сілы, аб тэхнэрсанале і г. д.

Такія адносіны адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу прадпрыемстваў недапушчальны і злачынны. Патрэбны суровыя меры спагнаньня ў адносінах да тых, хто не разумее ўсёй сур'ёзнасьці пытаньня своячасовай падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону.

П. ВАШУКЕВІЧ.

Не хапае 9.000 будаўнікоў

МАГІЛЕЎ (наш кар.). Каб правесьці будаўнічы сэзон, Магілеўскай акрузе патрэбны 22.700 рабочых-будаўнікоў. Між тым, па горадзе і акрузе ўлічана каля 13.500 рабочых, якіх можна скарыстаць на будаўнічых работах. Такім чынам, у гэтым сэзоне ня хопіць больш за 9.000 рабочых-будаўнікоў.

Пытаньне аб вярбоўцы патрэбнай рабочай сілы патрабуе самай сур'ёзнай увагі з боку ўсіх мясцовых арганізацый.

У раёнах Магілеўскай акругі існуюць 3 карэспандэнцкія пункты біржы працы; райвыканкомы, сельсаветы, камітэты ўзаемадапамогі павінны дапамагчы карэспандэнцкім пунктам вывяць усю кваліфікаваную будаўнічую рабочую сілу, а таксама чорнарабочых па Магілеўскай акрузе. Арцелі чорнарабочых для будаўнічых работ трэба вербаваць з беднякоў і батрацтва.

Трэба ліквідаваць такія зьявішчы, калі будаўнічыя арганізацыі праводзяць самастойную вярбоўку на раёнах бяз біржы працы і тым дэзарганізуюць рынак працы.

Прафарганізацыі саюзу будаўнікоў па вінны паклапаціцца ўжо аб своячасовым заключэньні ўмоў з будаўнічымі арганізацыямі на рабочую сілу, дабіўшыся забясьпечэньня сэзоньнікаў патрэбным жыльлём, сталоўкамі, ларкамі, увядзеньнем адзіных расцэнак за адпоўкавую работу па ўсіх гаспадарчых арганізацыях.

Б.

З жыцьця АДУЧ армії

ЗА АРКАЙ МЯЖЫ

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

VIII

Апошнія японаўскія войскі ўцяклі з Хайляру. Зноў пачалося стыхійнае грабежніцтва, горад тануў у чорным дыме пажару, салдаты выцягвалі з дамоў савецкіх грамадзян і гвалтам уціскалі ў перапоўненыя вагоны Жыхары Хайляра ратаваліся ў стэпу, замярзалі ў тайгікох сопак, іх лавілі і забівалі на месцы. Жахлівае чалавечае выцьцё нялося з палаючых дамоў на вуліцах грудзі ліся пасечаныя трупы. Паўзвар'яцелыя жанчыны, поўзаючы ў пыле, умалялі, прасілі літасьці. Аледзянелымі камякамі валяліся перарэзаныя дзеці. Салдаты каршакамі наляталі на магазыны і, калі ня было тавараў, разьдзявалі ўласьнікаў, вырывалі залатыя зубы. Зямля дрыжэла ад выбухаў, рухнуў чыгуначны мост, эшалёны на тот бок гораду былі гатовы да адыходу, засталося некалькі галзін і войска навінна было зьнішчыць горад.

Абурэньне і злосьць ахапілі насельніцтва. Каля пажарнай каманды сабраліся патоўпы гараджан і хутка сюды зьбегся ўвесь горад. Ля пажарнага будынку крычалі, стагналі, плакалі, чутны

Не адміністраваньнем, а сапраўднай мабілізацыяй беднякоў і сераднякоў на падставе суцэльнае калектывізацыі нанясем сьмяротны ўдар кулацтву, як клясе

Ня проста раскулачваць, а абагульваць канфіскаваныя кулацкія сродкі вытворчасьці

НАКІРАВАЦЬ АГОНЬ ПА КУЛАКУ—НЕ ЗАКРАНАЦЬ СЕРАДНЯКА

ТРАКТАРЫ КАЛГАСАМ

Пастановай саюзнага ўраду ўсесаюзаму аўта-трактарнаму аб'яднаньню дазволена выпусьціць на 50 мільёнаў руб. трактарных абавязацельстваў. З гэтай сумы на БССР трактарныя абавязацельствы могуць быць праданы на 1.300 тыс. руб. (1 сэрыі на 820.000 руб. і 2-я сэрыі—на 480.000 руб.

З усіх куткоў савецкай краіны нясуцца патрабаваньні і заяўкі на новыя і новыя сотні і тысячы трактараў, а ў сувязі з гэтым расьце і патрэбнасьць у сродках для ўкладаньня іх у заводы, якія гэтыя патрэбныя трактары будуць выраблядь.

Выпуск трактарных абавязацельстваў ўсесаюзным аўта-трактарным аб'яднаньнем («ВАТО») дасьць магчымасьць сабраць зараз патрэбныя залаткі для пашыранай вытворчасьці трактараў з тым, каб гэтыя трактары выдаць трымальнікам трактарных абавязацельстваў, галоўным чынам, калгасам.

Кожнае абавязацельства каштуе 50 р. Уся сума трактарных абавязацельстваў падзяляецца на дзьве сэрыі. Трактарныя абавязацельствы 1-й сэрыі выпускаюцца з тэрмінам пагашэньня іх 1-га лютага 1931 году. Прадаюцца абавязацельствы гэтай сэрыі гатоўкаю, без растэрміноўкі плянажу. Трактарныя абавязацельствы 2-й сэрыі выпускаюцца з тэрмінам пагашэньня іх — 1-га жніўня 1931 году. Пры продажы абавязацельстваў гэтай сэрыі дасцца растэрміноўка плацяжу, прычым палова кошту абавязацельстваў павінна быць заплачана не пазьней 1-га красавіка 1930 году, а другая палова—не пазьней 1-га верасьня 1930 году.

Трактарныя абавязацельствы прадаюцца калгасам, іншым вытворчым сельска-гаспадарчым арганізацыям, машына-трактарным станцыям і калёнам, саюзам с.-г. каапэрацыі і іншым арганізацыям, а таксама асобным селянскім гаспадаркам.

Калектыўныя гаспадаркі і іншыя вытворчыя с.-г. каапэрацыйныя арганізацыі і машына-трактарныя станцыі і калёны, якія прадаўвалі трактарныя абавязацельствы 1-й сэрыі на суму ня менш 40 проц. кошту трактара, атрымаюць трактар не пазьней 1-га лютага 1931 году. Гэтыя-ж арганізацыі, што прадаўвалі трактарныя абавязацельствы 2-й сэрыі на суму ня менш 35 проц. кошту трактара, атрымліваюць трактар не пазьней 1-га жніўня 1931 году.

Асобныя селянскія гаспадаркі могуць бесьперашкодна ўносіць трактарныя абавязацельствы ў любой суме, у якасьці ўносаў у спэцыяльныя непадзельныя капіталы, якія ствараюцца с.-г. каапэрацыйнымі саюзамі для арганізацыі машына-трактарных станцый і калён.

Абавязацельствы прадаюцца ва ўсіх канторах і аддзяленьнях Дзяржбанку, калгассаюзах і кредытных таварыствах.

Усім акругам БССР трэба разгарнуць шырокую растлумачальную кампанію ў вёсцы па куплі трактарных абавязацельстваў. Калі асобныя акругі і раёны будуць адставаць у рэалізацыі абавязацельстваў і да наўнага тэрміну замацаванай за імі колькасьці абавязацельстваў не рэалізуюць, то ня выключана магчымасьць, што органы Наркамзему прымуцтаны будуць перагледзець сваю раскладку і перараўмеркаваць яе па іншых акругах і раёнах, дзе рэалізацыя трактарных абавязацельстваў будзе ісьці з большым посьпехам.

Нам трэба неадкладна прыступіць да разгортваньня кампаніі па продажы трактарных абавязацельстваў.

Наўкола гэтага пытаньня павінна быць мабілізавана ўвага ўсіх нашых партыйных, савецкіх, грамадзкіх і прафесыянальных арганізацый, прычым энэргічны ўдзел у растлумачальнай рабоце ў вёсцы павінны цьвіняць рабочыя брыгады.

Усе зьвенні нашай сельска-гаспадарчай каапэрацыі, калгасныя аб'яднаньні, калгасы павінны разгарнуць энэргічную работу па рэалізацыі трактарных абавязацельстваў.

Мы павінны дабіцца, каб уся сума абавязацельстваў, вызначаная для БССР, была рэалізавана поўнасьцю ў найбольш кароткі тэрмін.

ЯРШОЎ.

АЧЫСЬЦІМ КАЛГАСЫ АД КУЛАКОЎ

(Ад нашага магілеўскага карэспандэнта)

У Магілеўскай акрузе зараз скончыліся раённыя зьезды калгасьнікаў. На ўсіх зьездах калгасьнікі ўносяць пастановы аб безадкладным высяленьні кулакоў з тэрыторыі калгасаў, канфіскацыі іх сродкаў вытворчасьці і перадачы іх у калгасы.

Сход групы беднаты Грыбавецкага сельсавету, Чачавіцкага раёну, пастанавіў неадкладна прыступіць да раскулачваньня. Зьезд калгасьнікаў Лупалаўскага раёну вынес пастанову ў двухтыдневы тэрмін ачысьціць усе калгасы ад кулакоў.

У Магілеўскім раёне ў Цішаўскім сельсавеце пры актыўным удзеле батрацка - бядняцкіх мас прыступілі да раскулачваньня. У кулакоў канфіскавана 500 пуд. насеньня, шмат машын і жывёлы. Усё гэта адразу перадана калгасам. Да раскулачваньня прыступілі і ў іншых сельсаветах і раёнах. Але-ж трэба адзначыць, што на мясцох партыйныя і савецкія арганізацыі яшчэ ня ўсюды прыступілі практычна да ажыцьцяўленьня патрабаваньняў батрацка - бядняцкіх мас аб раскулачваньні.

А. С.

Мітынг Самарскае каўдывізіі

Учора ў Доме Культуры адбыўся мітынг часьцей 7-ае Самарскае кавдывізіі, прысьвечаны выхаду дывізіі ў аграпаход.

З дакладам аб аграпаходзе выступіў начпадзіву т. Бачароў.

У выступленьнях і рэзалюцыі байцы-кавалерыстыя запэўняюць РВС БВА ў тым, што задачы, пастаўленыя перад часьцямі, яны выканаюць з гонарам. Яны абяцаюць пры адыходзе ў бестэрміновы водпуск ад'ехаць з дывізіі ўжо калгасьнікамі.

Для лепшага правядзеньня аграпаходу пастанавілі выклікаць на сацыялістычнае спаборніцтва Беларускую дывізію і Чангарскую кавдывізію.

Байцы катэгарычна пратэстуюць супроць нагнага налёту белагвардзейцаў на кіраўніцтва К.-У. чыгункі і патрабуюць ад ураду рашучых мер да спыненьня гэтай агіднасьці.

Мітынг прайшоў з вялікім уздымам

Не вядуць работы сярод беднаты

(Круглянскі раён суцэльнае калектывізацыі)

Круглянскі раён (Аршаншчына) гэта амаль суцэльны калгас. У раёне калектывізавана 95 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак. Ня гледзячы на гэта, у раёне не вядзецца пікае растлумачальнае работы сярод батрацка - бядняцкіх мас, нічога ня зроблена для арганізацыі батрацка - бядняцкіх груп у калгасах. **Некаторыя раённыя працаўнікі выказваюцца нават супроць арганізацыі такіх груп.** У рад калгасаў пралезьлі кулакі, якія вядуць там контр-рэвалюцыйную агітацыю. Між тым, раённыя арганізацыі **нічога ня робяць для чысткі калгасаў ад варожых кулацкіх элемэнтаў.**

Кулацтва ў раёне вядзе шалёную агітацыю супроць калгасаў, імкнецца разваліць арганізаваныя калгасы. Кулакі хаваюць у некаторых несьвядомых беднякоў сваю маемасьць і жывёлу, падкупаюць іх падачкамі. Тлумачыцца ўсё гэта тым, што беднота і батракі не згуртаваны мясцовымі арганізацыямі вакол важнейшых мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да сяўбы, па ліквідацыі кулацтва, як клясы ў раёнах суцэльнае калектывізацыі.

У раёне налічваецца каля 280 кулацкіх гаспадарак. Ня гледзячы на гэта ў Круглянскім раёне суцэльнае калектывізацыі да раскулачваньня яшчэ **практычна ня прыступлена. Увага батрацка - бядняцкіх** мас не мабілізавана вакол гэтага пытаньня.

Супроць кулакоў, якія актыўна шкодзяць калектывізацыі, раённыя ўлады таксама ня прымаюць ніякіх рашучых мер, абмяжоўваюцца агульнымі разважаньнямі.

Падрыхтоўка да сяўбы ў раёне таксама праводзіцца вельмі марудна. Дырэктыва партыі і ўраду аб агульнымі пасеньня і жывёлы ў калгасах ня выканана. Дагэтуль абагулена толькі 200 тон пасеньня, або 11 проц. заданьня, жывёлы абагулена яшчэ менш. І гэта за 5 дзён да вызначанага ўрадам тэрміну.

БРЫГАДА «ЗЬВЯЗДЫ».

Два віды скажэньня палітыкі партыі

Ніжэй мы друкуем матар'ялы, у якіх прыводзіцца рад агідных фактаў скрыўленьняў палітыкі партыі ў пытаньнях калектывізацыі і раскулачваньня. У асноўным наглядаюцца скрыўленьні двух відаў.

З аднаго боку, няправільна праводзіцца голае раскулачваньне — бяз усякай арганічнай сувязі з калектывізацыяй, складаючы частаю якое раскулачваньне зьяўляецца. Так, Бюро Бабруйскага акругкому партыі, напрыклад, канстатуе, што раскулачваньне ў радзе раёнаў Бабруйскае акругі ня ўвязваецца з задачамі арганізацыі калгасаў. Неразуменьне сваіх задач некаторымі мясцовымі арганізацыямі Бабруйшчыны падкрэсьліваецца яшчэ наступным абураючым фактам. У Рагачэўскім і Парычкім раёнах быў арыштаваны рад беднякоў і сераднякоў, якія выступалі супроць калектывізацыі, з прычыны неразуменьня імі значэньня і сутнасьці калектывізацыі. Такім чынам, мы наглядаем тут адміністраваньне, якім падмяняюць сур'ёзную растлумачальную работу сярод бедняцка - сераднякіх мас вёскі.

З другога боку, мы наглядаем і скрыўленьне другога тыпу — спрыяльныя, прымірэнчыя адносіны да кулака ў раёнах суцэльнае калектывізацыі, ня гледзячы на патрабаваньні калгасьнікаў, беднякоў, і сераднякоў, якія ўступаюць у калгасы. У Круглянскім раёне суцэльнае калектывізацыі (Аршанская акруга), напрыклад, дзе калектывізацыя амаль ахапіла ўсе 100 проц. бядняцка - сераднякіх гаспадарак, да раскулачваньня мясцовыя арганізацыі яшчэ амаль не прыступілі. Бядняцка - батрацкая маса да ажыцьцяўленьня гэтае важнейшае палітычнае задачы ня прыцягнута. Гэткія-ж прымірэнчыя адносіны да кулацтва наглядаюцца і ў Чэрыкаўскім раёне суцэльнае калектывізацыі (Магілеўская акруга), які калектывізаваны ўжо на 95 проц. Ліквідацыя кулацтва, як клясы, у гэтым раёне праходзіць вельмі вяла і амаль бяз удзелу батрацтва беднаты.

Да чаго прыводзяць такія прымірэнчыя адносіны да кулака?

Аб гэтым выразна сьведчаць факты, якія прыводзяцца ў тых-жа карэспандэнцыях. Вось гэтыя факты. У рад калгасаў Круглянскага раёну суцэльнае калектывізацыі пралезьлі кулакі, якія вядуць там контр - рэвалюцыйную агітацыю. Мясцовыя-ж арганізацыі нічога ня робяць, каб ачысьціць калгасы ад клясавага ворага. Ня дзіва, што кулацтва разьвіло вялікую актыўнасьць і імкнецца разваліць арганізаваныя калгасы, падкупае несьвядомых беднякоў дробнымі падачкамі і хавае ў іх свае сродкі вытворчасьці і маемасьць. Супроць школнікаў - кулакоў раённая ўлада і мясцовыя арганізацыі ня прымаюць ніякіх рашучых мер, абмяжоўваючыся толькі агульнымі разважаньнямі.

Такі самы малюнак мы маем і ў Чэрыкаўскім раёне суцэльнае калектывізацыі, дзе кулак выяўляе выключную актыўнасьць, разьвіўшы шалёную шкодніцкую дзейнасьць.

Мясцовыя арганізацыі гэтых раёнаў суцэльнае калектывізацыі ня лічаць патрэбным зьвярнуць адпаведную ўвагу на арганізацыю батрацтва і беднаты. У Круглянскім раёне нічога яшчэ ня зроблена для арганізацыі батрацка-бядняцкіх груп у калгасах. Агідны факт—некаторыя раённыя працаўнікі выказваюцца нават супроць арганізацыі такіх груп. Вольнае манэўраваньне кулацтва ў гэтым раёне суцэльнае калектывізацыі тлумачыцца, галоўным чынам, тым, што ў ім не згрупаваны батрацка-бядняцкія масы на барацьбу з кулацтвам.

Дэмабілізацыйныя настроі ў барацьбе з кулацтвам, у барацьбе за яго ліквідацыю, як клясы, недапушчальныя. Яны зьяўляюцца праяўленьнем правага апартунізму на практыцы.

Недапушчальны і такія мэтады раскулачваньня, якія ня зьвязаны і не вынікаюць з працэсу калектывізацыі, такія мэтады калектывізацыі, якія здараліся ў Парыцкім і Рагачэўскім раёнах.

Беднота, батрацтва і серадняк ў раёнах суцэльнае калектывізацыі ўсё больш настойліва патрабуюць ліквідацыі кулацтва. Адных рэзалюцый і разважаньняў недастаткова. Бядняцка - батрацкае ядро ў калгасах павінна ўважліва сачыць за правільнасьцю ходу калектывізацыі і за раскулачваньнем, якое вынікае з суцэльнае калектывізацыі.

Узмацніць тэмпы калектывізацыі, праводзіць работу па раскулачваньні ў раёнах суцэльнае калектывізацыі, узмацніць арганізацыю беднаты і батрацтва, не аддзяляць раскулачваньня ад калгаснага будаўніцтва, не закранаць серадняка, не падмяняць голым адміністраваньнем растлумачальнае работы сярод беднаты і сераднятва—вось задачы, якія стаяць перад нашымі партыйнымі арганізацыямі.

Не дапушчаць скрыўленьня лініі партыі

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Бюро Бабруйскага акруговага камітэту КП(б)Б заслухала даклад аб падрыхтоўцы да веснавое сяўбы. Бюро канстатавала, што падрыхтоўка ідзе нездавальняюча. Раскулачваньне ня ўвязваецца з задачамі арганізацыі калгасаў. Увага беднякоў і сераднякоў слаба мабілізавана вакол пытаньня аб ліквідацыі кулацтва, як клясы ў раёнах суцэльнае калектывізацыі.

У паасобных раёнах (Рагачэў, Парычы) былі скрыўленьні лініі партыі —арыштаваны рад беднякоў і сераднякоў, якія, не зразумеўшы значэньня калектывізацыі, выступалі супроць яе.

Зусім дрэнна праводзіцца абагуленьне насеньня і жывёлы. Тэмп арганізацыі калгасаў павольны.

Бюро АК запрапанавала фракцыям адпаведных арганізацый да 7-га лютага абагуліць поўнасьцю усё насеньне і ачысьціць яго, на працягу двух тыдняў абагуліць на 100 проц. жывёлу і інвэнтар ва ўсіх калгасах.

За невыкананьне дырэктыў аб рэарганізацыі сыстэмы сельска - гаспадарчае каапэрацыі вынесена вымова фракцыі Сельсаюзу.

РАМОНТ МАШЫН К ВЯСЬНЕ

Прымірэнчыя адносіны да кулака

(Чэрыкаўскі раён суцэльнай калектывізацыі)

Раскулачваньне ў Чэрыкаўскім раёне суцэльнай калектывізацыі ідзе павольна. Мясцовыя арганізацыі не ўявілі сабе значэньня раскулачваньня ў раёнах суцэльнае калектывізацыі. У некаторых мясцох раёну наглядаюцца прымірэнчыя адносіны да кулакоў.

Між тым, у тых мясцох, дзе арганізацыі зразумелі важнасьць гэтай спраны батрацка - бядняцкія, а за імі і сераднякіх масы прымаюць самы актыўны ўдзел у раскулачваньні. У кулакоў канфіскуецца рабочая і прадукцыйная жывёла, насеньне, машыны, маслабойкі і млыны, якія перадаюцца ў калгасы.

У некаторых кулакоў было знойдзена закапанага збожжа па 300-400 пуд. У аднаго кулака знайшлі 5-ці сілавы паравік.

Кулакі жорстка супраціўляюцца раскулачваньню, імкнуцца сарваць веснавую пасеўную кампанію.

Уноч з 29 на 30-га студзеня ў вёсцы Шчацінцы, Лабаноўскага сельсавету, кулакі падпалілі сьвірань, які быў падрыхтаваны для ссыпкі насеньня. Дзякуючы чырвонаармейцу, які прымкнеціў пажар, сьвірань быў выратаваны.

Калгасьнікі павінны зараз-жа ўстанавіць пільны нагляд і варту за ўсёй маемасьцю калгасаў.

Поп вёскі Галоўчыцы, арганізаваўшы кулацтва, вядзе агітацыю супроць калгасу. Асабліва на папоўскую і кулацкую агітацыю паддаюцца жанчыны, як найбольш адсталыя. Да загадчыка раённаю земчасткаю Лукачова зьявіліся 20 кабет з заявамі аб выхадзе з калгасу. На запытаньне, чаму яны хочуць выйсьці з калгасу, кабеты адказалі: «кажуць, што ў вас тут, у Чэрыкаве, у больніцы шмат баб, якія паразьбівалі адна другой галовы з-за гаршкоў, а мы біцца ня хочам, таму і выпісваемся з калектыву». Пра гэта ім гаварыў былы афіцэр. Прышлося паказаць кабетам больніцу, каб яны наглядзелі ці ёсьць там бабы з пабітымі з-за гаршкоў галавамі.

Батрацка - бядняцкія масы, а за імі і сераднякі, даюць зараз рашучы адпор папоўска - кулацкай контр - рэвалюцыйнай агітацыі.

БРЫГАДА «ЗЬВЯЗДЫ».

Распродваньне і ўбой жывёлы ня спыняюцца

Дырэктывы ўраду на мясцох ня выконваюцца

Нізавыя каапэрацыйныя арганізацыі злачынна нядбайна адносяцца да адбору жывёлы для калгасаў

БЯЗЬЛІТАСНА ЎДАРЫЦЬ ПА КУЛАКУ, ЯКІ НІШЧЫЦЬ ЖЫВЁЛУ І АГІТУЕ ЗА ПРОДАЖ ЯЕ

Тысячы цялят ідуць пад нож

(Ад нашага бабруйскага карэспандэнта)

Мы праводзім месячнік жывёлагадоўлі, мы крычым аб недапушчальнасьці забою малочнае жывёлы і маладняка. Выносяцца пастановы аб абавязковай гадоўлі цялят у калгасах.

Але факт застаецца фактам—цяляты і дагэтуль сотнямі ідуць пад нож.

У БАБРУЙСКУ НА БОЙНІ ЗА МЕСЯЦ АДАБРАНА ЎСЯГО КАЛЯ 10 ЦЯЛЯТ. А МІЖ ТЫМ ПАД НОЖ ПАЙШЛІ БОЛЬШ 440 ЦЯЛЯТ.

На прыгонным пункце акруговага малочна-жывёлагадоўчага саюзу адабрана ЎСЯГО 13 ЦЯЛЯТ.

Белмясгандаль ЗАКУПІЎ ЗА МЕСЯЦ 30 ЦЯЛЯТ І ЎСЕ ЯНЫ ПАЙШЛІ ПАД НОЖ—ні аднэй не адабрака на гадоўлю.

Характэрна адзначыць, што паводле слоў загадчыка бойні, ён і дагэтуль НЕ АТРЫМАЎ ЗАГАДУ АБ АДБОРЫ ЦЯЛЯТ.

За месяц Скурсындыкат загатовіў 2.250 цялячых скурак, з іх 1.099 скурак цялят ва ўзросьце да 1 месяца і 1.151 скурка цялят—ва ўзросьце да 1 году. 2.250 ЦЯЛЯТ ЗАБІТА ЗА АДЗІН ТОЛЬКІ МЕСЯЦ. Нямала забіта таксама памяма бойні.

Характэрна адзначыць, што даўма толькі прыватнікамі за два тыдні забіты на бойні 63 цяляты.

Усё гэта прымушае нас з усёй рэзкасьцю паставіць пытаньне аб САМАЙ ЖОРСТКАЙ БАРАЦЬБЕ з такой зьявай. Нашы райвыканкомы, сельсаветы павінны рашуча ўзяцца за ахову маладняка ад забойства.

РСІ павінна зацікавіцца, наколькі нашы загатоўчыя арганізацыі выконваюць дырэктывы аб адборы цялят на гадоўлю, і вінаватых прыцягнуць да адказнасьці.

А. МАГІДАЎ.

Камбінат у яўрэйскім калгасе

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). У яўрэйскім калгасе «Заходы», Рэчыцкага раёну, будуецца камбінат з крухмальнага заводу, лесапільні, паравога млына і сукнавальні. На будаўніцтва камбінату Белкамзет адпусьціў 250.000 руб.

Да вясны ў калгас будзе прынята яшчэ 100 бядняцкіх сямей. Зараз у калгасе працуе завод па вырабе галяндскага сыру.

Рашуча праводзіць у жыцьцё пастановы ўраду

(Гутарка з намесьнікам старшыні СНК т. Бэнэкам)

Пастанова СНК аб спыненьні масавага зьнішчэньня скаціны да гэтага часу на мясцох праводзіцца ў жыцьцё вельмі слаба. Скаціна паступае на рынак у яшчэ большай колькасьці, чым да выданьня закону. Такое зьявішча тлумачыцца тым, **што кулак раней,** чым закон пачаў праводзіцца мясцоваю ўладаю ў жыцьцё, **пачаў хутчэй распрадаваць і зьнішчаць скаціну.**

Ёсьць выпадкі, калі кулак, выратоўваючы сваю маемасьць, адпраўляў яе ў гарады і мястэчкі да сваіх знаёмых і нэпманаў. Мясцовая ўлада на гэта зьявішча не зварачала амаль ніякае ўвагі.

СНК у дадатак да сваёй пастановы ад 12-га студзеня пастанавіў пашырыць сваю пастанову таксама на нэпманаў і кулакоў, якія жывуць у гарадох і мястэчках і зьнішчаюць скаціну.

Гарсаветам даецца права канфіскаваць жывёлу і маемасьць у нэпманскіх элемэнтаў гораду і мястэчка за злоснае зьнішчэньне скаціны і за падбухторваньне да зьнішчэньня яе бядняцка-сераднякімі пластамі вёскі.

Гэта пастанова пры энэргічным правядзеньні яе ў жыцьцё **павінна прыпыніць зьнішчэньне** скаціны, якая ёсьць у мястэчках і гарадох.

Органы юстыцыі, міліцыі і райвыканкому павінны больш рашуча праводзіць у жыцьцё пастановы СНК і ўжываць тыя меры адміністрацыйна - судовага спагнаньня, якія прадугледжаны законам.

Неабходна паскорыць выданьне інструкцыі, якая-б рэгляментавала забой маладняка і скаціны.

Далейшае правядзеньне мясазатоўчай работы ранейшымі мэтадамі павінна быць бязадкладна зьменена. Загатоўчыкі павінны перабудаваць сваю работу ў напрамку найбольшага захаваньня стада.

Усялякі забой і продаж скаціны павінен рабіцца з дазволу сельсаветаў або праўленьня калгасаў.

Пры энэргічнай рабоце савецкіх органаў на мясцох, увазе да гэтага пытаньня з боку партыйных арганізацый і ўсёй савецкай грамадзкасьці на вёсцы, — мы даб'емся спыненьня зьнішчэньня скаціны.

Да адказнасьці за зрыў мерапрыемстваў ураду

Ня гледзячы на рад канкрэтных дырэктыў ЦК партыі і ўраду аб арганізацыі адкормачных пунктаў і барацьбе з распродажам і забоем прадукцыйнае жывёлы, загатоўчыя і каапэрацыйныя арганізацыі праяўляюць да гэтай справы самыя агідныя адносіны.

Заданьне па адкорме сьвіней ня выканана.

Белсельтрэст да гэтага часу не паставіў на адкорм у саўгасы Меншчыны ні аднэй жывёлы пры заданьні ў 400 галоў. Саўгасы са свайго боку таксама не праяўляюць ініцыятывы.

А Менскі ЦРК праявіў яшчэ больш нядбайныя адносіны, за якія трэба прыцягнуць да адказнасьці.

ЦРК не падрыхтаваўся да прыёму сьвіней, не абсталяваў хлявоў. Партыя ў 85 сьвіней, якая была атрымана ад менскага аддзяленьня Белкамзепсаюзу, некалькі дзён знаходзілася на марозе. У выніку 200 сьвіней захварэла на чуму, рэшта па якасьці нягодная для адкорму.

Наогул, ніхто з загатоўчых і каапэрацыйных арганізацый ня мае дакладных вестак аб тым, што робіцца на мясцох з пастаўкай на адкорм сьвіней і рагатай жывёлы.

Ёсьць весткі, што некаторыя каапэрацыйныя арганізацыі так праводзяць засолку мяса, што гэтае мяса гніе і яго прыдзецца выкінуць.

Скурсындыкат і інш. загатоўчыя арганізацыі пры выкананьні сваіх плянаў выходзяць толькі з камэрцыйных меркаваньняў і аусім ня цікавяцца праблемай жывёлагадоўлі.

Наркамгандаль БССР амаль нічога не зрабіў, каб своячасова ўвязаць плян загатоўчых арганізацый з дырэктывай аб барацьбе з распродажам жывёлы. Месцы ня маюць наконт гэтага пэўных указаньняў.

Наглядаецца рад фактаў адмаўленьня калгасаў ад прыёму жывёлы, а таксама несваячасовай прыёмкі гэтай жывёлы.

Наркамзем і калгассаюз не прынялі мер, каб своячасова ліквідаваць такія зьявішчы.

Белмалжывсаюз яшчэ дагэтуль не паставіў перад адпаведнымі органамі ва ўсю шырыню праблемы жывёлагадоўлі.

Усе гэтыя факты выявіліся на нарадзе пры Менскай акруговай пракуратуры.

Нарада вызначыла рад важных мерапрыемстваў па выкананьні заданьня па адкорме сьвіней і барацьбе з распродажам і забоем прадукцыйнай жывёлы.

Усім вучастковым пракурорам, сьледчым і органам дазнаньня прапанавана выявіць арганізацыі і ўстановы, якія ня выконваюць заданьняў аб загатоўцы і адкорме сьвіней і рагатай жывёлы.

Пракуратура ўжо ўзбудзіла буйную справу супроць работнікаў раду менскіх устаноў, якія сарвалі арганізацыю і пабудову адкормачных пунктаў.

Адначасова акруговая пракуратура ўжо ўзбудзіла каля 25 спраў супроць кулакоў за распродаж і забой прадукцыйнай жывёлы.

М. К.

ЗЛАЧЫННЫЯ АДНОСІНЫ ДА АДБОРУ ЖЫВЁЛЫ

Ня гледзячы на тое, што на куплю і адбор прадукцыйнае жывёлы асыгнаваны сродкі, трэба адзначыць, што адборачныя камісіі працуюць вельмі слаба.

Да гэтага часу работа адборачных камісій яшчэ не наладжана і адсутнічае ўвязка работы з загатоўчымі арганізацыямі. Ёсьць дэлы рад выпадкаў, якія паказваюць, што пытаньню адбору прадукцыйнае жывёлы аддаецца вельмі мала ўвагі.

Напрыклад, на Менскай бойні па некальні дзён стаіць адабраная жывёла і ніхто яе не забірае. Акруговы малочны саюз спасылаецца на тое, што загатоўчыя арганізацыі павінны выдаваць адабраную скаціну бяз грошай. Наглядаецца таксама неарганізаванасьць у разьмеркаваньні адабранае жывёлы. **У Заслаўлі ўжо 10 дзён стаіць адабраная жывёла і ніхто яе не забірае. У Воршы ўжо тры тыдні стаіць каля 300 галоў адабранае жывёлы і ніхто ня прыходзіць па яе.**

Трэба адзначыць, што жывёла, якая прастайвае на адборачных пунктах на некалькі дзён, траціць вагу, псуецца і ўжо ня здатна для калгасаў.

Абагуленьне жывёлы ідзе вельмі павольна

ЧЭРЫКАЎ (Брыгада «Зьвязды»). Абагуленьне жывёлы па Чэрыкаўскім раёне суцэльнае калектывізацыі праводзіцца вельмі дрэнна. На сёньняшні дзень абагулена толькі пязначная колькасьць жывёлы.

Ня гледзячы на пастанову СНК БССР, жывёла яшчэ распрадаецца. Таемна, а часта з ведама праўленьня калгасу, ідзе забой коняй, кароў і асабліва маладняка—цялят.

За студзень, паводле пяцёўных вестак, забіта 189 кароў, 190 коняй і 518 цялят. За кароткі тэрмін у адным калгасе «Чырвоны Кастрычнік» (Ветрынскі сельсавет) распрадана 40 галоў жывёлы. Распродажу і зьнішчэньню жывёлы актыўна дапамагае старшыня калгасу Галаўнёў і старшыня сельсавету—член партыі з 1919 году Макштараў.

Апошні на пасяджэньні сельсавету дабіўся пастановы зьняць індывідуальнае абкладаньне з свайго брата; першоўны ў калгас, ён прадаў хутчэй карову. Такім калгасьнікам і членам партыі ня месца ў нашых радох.

Райвыканком і пракуратура павінны ажыцьцявіць закон аб прыцягненьні да крымінальнай адказнасьці тых, хто распрадае і забівае жывёлу.

Крэдыты, асыгнаваныя на куплю для калгасаў лепшых парод прадукцыйнай жывёлы, не скарыстоўваюцца. Чэрыкаўскае крэдытнае таварыства пасылае райвыканкому адносіну, што рабіць з гэтымі крэдытамі (18.000 руб.). Райвыканком разводзіць рукамі і пытаецца ў Магілеўскага жывёлагадоўчага саюзу. Той адказвае, што «ў вас ёсьць адборачная камісія (існуе па паперы), няхай яна купіле лепшую жывёлу ад сялян, якія прадаюць кароў і коняй.

Акркалгассаюзу і малочна-жывёлагадоўчаму саюзу трэба зараз-жа падумаць аб тым, дзе можна купіць патрэбную колькасьць лепшай прадукцыйнай жывёлы для чэрыкаўскіх калгасаў.

Нельга дапусьціць, каб крэдыты, прызначаныя на пашыраньне жывёлагадоўлі, ляжалі нескарыстаныя.

Брыгадзір В. ВОІНАЎ.

ПА БССР

Як ідзе абагуленьне насеньня

ВІЦЕБСК (наш кар.). Па 31-га студзеня па акрузе абагулена ў калгасах 26,8 проц патрэбнае колькасьці насеньня—аўсу, ячменю і ільну.

Провады рабочых-калгасьнікаў

ГОМЕЛЬ (наш кар.). З 127 рабочых, якія скончылі Гомельскія курсы калгасьнікаў, паслана 80 чал. у калгасы Гомельшчыны, 35 чал.—у калгасы Мазырыншчыны і 12 чал.—у Бабруйскую акругу.

На прадпрыемствах і ў рабочых клюбах адбыліся вечары провадаў калгасьнікаў, на якіх былі пастаўлены даклады раду калгасаў.

Паміж рабочымі і выпучанымі ў калгасы заключаюцца сацыялістычныя дагаворы на поўнае выкананьне прамфінпляну, выкананьне пляну калектывізацыі, арамаджаньне сродкаў вытворчасьці і жывёлы і г. д.

Затрымліваецца пабудова бэконнага заводу

ГОМЕЛЬ (наш кар.). Яшчэ ня скончана пабудова бэконнага заводу у Новасёлках. На пабудову выдаткавана 29 тыс. рублёў, для скончаньня патрэбны яшчэ 10 тыс., але акрфінадзел выключыў гэтую суму з бюджэту. Сьвіней, якіх прывозяць у Гомель, няма куды дзець.

Запежы фасфарытнай мукі на Каробчынскім млыне

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. (Наш кар.). Дырэктар Каробчынскага фасфарытнага млына паведамляе, што фасфарытная мука вытворчасьці млына вельмі дрэнна разьмяркоўваецца паміж саўгасамі, калгасамі і індывідуальнымі гаспадаркамі. Калгасы нічога ня робяць, каб атрымаць каштоўнае ўгнаеньне.

На складах млына—вялікія запасы мукі.

Белсельснаб запрапанаваў Магілеўскому сельсаюзу дацэ свае нізоўцы дырэктывы адносна разьмеркаваньня фасфарытнае мукі, але сыстэма сельска-гаспадарчае каапэрацыі нічога ня робіць, каб нападзіць водпуск фасфарытнае мукі калгасам і саўгасам.

На барацьбу з „нэйтральнасьцю" спэцыялістых

ВОРША. (Наш кар.). Адбыўся паза чарговы зьезд інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў Аршанскага вучастку чыгункі. Зьезд прайшоў з вялікім уздымам. Галоўная ўвага зьезду была завострана на задачах рэканструкцыйнага пэрыяду. Зьезд зазначыў, што сэкцыя ІТС не рэагавала на шкодніцтва на вузьле.

Зьезд падкрэсьліў, што трэба моцна выцяць на «нэйтральнасьці», інэртнасьці інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў. Трэба ачысьціць рады ІТР ад варожых і чужых элемэнтаў.

Кулакі падпалілі склад з насеньнем калгасу

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). У Вульскім раёне кулакі падпалілі склад з насеньным фондам, які належаў калгасу «Бальшавік». Арыштаваны западозраны ў падпале вораг калектывізацыі—падкулачнік Цяпушка.

Безгаспадарчасьць на будаўнічых работах

ВАРЫСАЎ. (Наш кар.). Прэзыдыум гарсавету заслухаў даклад аддзяленьня Белдзяржбуду аб ходзе будаўніцтва. Выяўлена, што будаўніцтва ў мінулым годзе было пачата несвячасова, адсутнічалі ўдарныя брыгады, кепска працавалі вытворчыя камісіі, не вялася барацьба з рвацтвам асобных рабочых, ня выканана дырэктыва аб зьніжэньні сабекошту. Прэзыдыум гарсавету пастанавіў зьняць з работы загадчыка аддзяленьня Рубінштэйна.

Клюб у будынку вясковай царквы

САМАХВАЛАВІЧЫ. (Наш кар.). У вёсцы Ячанка, Возерскага раёну, адбылася ўрачыстасьць адкрыцьця клюбу ў памяшканьні былое царквы.

Агульны сход беднякоў і сераднякоў аднагалосна пастанавіў зьняць званы з царквы і перадаць іх у фонд Індустрыялізацыі. Сход выклікаў вёску Возеры пасьледаваць іх прыкладу.

Агляд Бабруйскай каапэрацыі

БАБРУЙСК (наш кар.). У агляднае работы каапэрацыі прымаюць удзел 27 рабочых брыгад. Брыгадзіры ўжо зрабілі кантрольныя закупкі, якія выявілі рад недахопаў у рабоце крам. Наглядаюцца няўважлівыя адносіны прыказчыкаў да заборных кніжак, недаборы, пераборы, няправільная вага, дрэннае санітарнае становішча крам. Папярэдняя фасоўка тавараў праводзіцца ня ўсюды. Паводле даных рабочых брыгад, ЦРК ахапіў рабочы бюджэт на 85 проц.

Што зроблена па лістох рабселькораў

— **Выключаны з партыі** Аршанскай РСІ Леган за ўтоўваньне сацыяльнага становішча і скажэньне клясавай лініі. А таксама выключаны з партыі Бацэлаг за сыстэматычнае п'янства, за сувязь з нэпманамі і ўжываньне рэлігійных абрадаў.

— **Выключаны з ліку студэнтаў** БДУ Лісіцкія Марыля і Ганна, як дочкі кулака з вёскі Чаканы, Заслаўскага раёну.

— **Правільна спынена справа,** як нам паведаміў нам. пракурора Менскай акругі, па абвінавачаньні гр-на Гілеўскага.

— **Зьняты з работы** і прыцягваецца да судовай адказнасьці сакратар Паўлаўскага сельсавету па заметцы «П'яніцы, дэзэртыры на спадчыне».

— **Выключана** з Барысаўскага тэхнікуму студэнтка Канавалава, як дачка кулака пазбаўленага выбарчага права.

— **Зьняты з работы** па першай катэгорыі (м. Нароўля) Шухман за скажэньне клясавай лініі, як былы гандляр, і ўзьнята пытаньне аб пазбаўленьні яго выбарчых праў.

— **Выключаны з камсамолу** сын кулака Курбіка і пастаўлена пытаньне аб выключэньні яго з сельска-гаспадарчай ак

Провады друкароў--калгасьнікаў

Пазаўчора ў клюбе друкароў адбыліся провады рабочых-калгасьнікаў.

Старшыня СНК БССР **т. Галадзед, падкрэсьліў** вялікую палітычную важнасьць задач, якія стаяць перад рабочай клясай наогул і перад ад'яжджаючымі ў калгасы паасобна. У раёнах суцэльнай калектывізацыі мы ліквідуем кулацтва, як клясу; іх сродкі вытворчасьці, жывёлу і зямлю мы перадаем у калгасы. Рабочыя, якія едуць на работу ў вёску, павінны быць арганізатарамі барацьбы з кулацтвам, павінны мабілізаваць і арганізаваць батрацтва і беднату на ўмацаваньне калгасаў, на ўдзел у перавыбарчай кампаніі. У падрыхтоўцы да веснавое сяўбы і г. д.

Сакратар Мен. АК КП(б)Б **т. Славінскі** падкрэсьліў, што вялізарны рост калектывізацыі, пасьляховае выкананьне пяцігодкі выклікаюць шалёнае супраціўленьне клясага-варожых элемэнтаў нашай краіны, а таксама і міжнародкай буржуазіі. Белагвардзейцы заграніцай увесь час прабуюць справакаваць СССР на вайну. Буржуазны друк зноў пачаў шалёную кампанію за разрыў паных мірных узаемаадносін. Задача рабочай клясы—яшчэ шчыльней згуртаваць свае рады вакол партыі.

Дэлегат калгасу «Чырвоны Колас» (Халопеніцкі раён) расказаў аб вялікім імкненьні бядняцка-серадняцкіх мас вёскі да новага жыцьця, да калгаснага будаўніцтва. Выступіўшы сакратар Фрунзаўскага райкому КП(б)Б **т. Гурэвіч**, адзначыў, што зараз рабочым прыдзецца зьвярнуць асаблівую ўвагу на шэфскую работу. Увесь рабочы калектыў павінен адказаць за становішча ў падшэфным раёне.

З ад'яжджаючых выступілі т. т. Мяцеліца і Ліпэрт, якія запэўнілі рабочых, што ўскладзеныя на іх задачы яны выканаюць.

Сход пастанавіў халайнічаць перад ЦВК СССР аб узнагародзе т. Сталіна другім ордэнам Чырвонага Сьцягу.

Датэрміновыя выпускі факультэтаў

Праўленьне БДУ устанавіла тэрмін навучаньня для фізыка-тэхнічнага і прыроднаўчага аддзяленьняў **Пэдфаку**—у 3½—4 гады, для садыльна-гістарычнага і літаратурнага—3 гады. У гэтым годзе адбудзецца два выпускі БДУ.

Тэрмін навучаньня па **Мэдфаку** ўстаноўлен у 4 гады. Скасоўваюцца дзяржаўныя экзамэны для 5-га курсу. Выпуск адбудзецца ў чэрвені гэтага году.

Факультэт права і гаспадарки рэарганізуецца ў два самастойныя факультэты: савецкага будаўніцтва і права і народнае гаспадаркі. Тэрмін навучаньня на абодвух факультэтах—3 гады.

Тэрмін навучаньня на **хэмфаку**—4 гады.

Месячнік ашчаднасьці

Ашчадныя касы--пад кантроль грамадзкасьці

Адна з задач, якую ставіць перад сабой «Месячнік ашчаднасьці»—гэта **актывізаваць і палепшыць работу самога ашчаднага апарату.**

Зразумела, што ад якасьці, выразнасьці работы ашчаднага апарату і належнага абслугоўваньня працоўных укладчыкаў у вялікай ступені залежыць далейшае разгортваньне ашчадспраны і аўтарытэт ашчадкас у вачох працоўных.

На вялікі жаль, прыходзіцца канстатаваць, што ня ўсюды ашчадны апарат знаходзіцца на вышыні пастаўленых перад ім задач.

Больш таго, мы маем выпадкі, калі нядбайная работа апарату падрывае аўтарытэт ашчадсправы, калі існуе безадказнасьць і недапушчальныя адносіны да работы.

Узяць, напрыклад, становішча і работу апарату **Віцебскай акруговай касы ашчаднасьці.** Становішча гэтага апарату і паводзіны працаўнікоў ня раз абмяркоўваліся партыйнай і камсамольскай ячэйкай.

Вось што апошняя на сваім пасяджэньні між іншым канстатавала:

— Загадчык аддзяленьня акруговай ашчадкасы **т. Смольскі** (член КП(б)Б) дэзарганізуе работу аддзяленьня, займаецца рвацтвам і г. д.

— З боку асобных камсамольцаў назіраецца зьяўнуць асаблівую ўвагу на шэфскую работу. Увесь рабочы калектыў павінен адказаць за становішча ў падшэфным раёне.

З ад'яжджаючых выступілі т. т. Мяцеліца і Ліпэрт, якія запэўнілі рабочых, што ўскладзеныя на іх задачы яны выканаюць.

Сход пастанавіў халайнічаць перад ЦВК СССР аб узнагародзе т. Сталіна другім ордэнам Чырвонага Сьцягу.

Пытаньне аб стане апарату ашчадкас у Віцебскай акрузе некалькі раз разглядалася на прэзыдыуме АВК і акругкоме КП(б)Б. Ня гледзячы на тое, што акруговай РСІ было прапанавана дапамагчы ўкамплектаваньню апарату кас ашчаднасьці адпаведнымі працаўнікамі, да гэтага часу гэта справа ня выраша-

Адна з задач, якую ставіць перад сабой «Месячнік ашчаднасьці»—гэта **актывізаваць і палепшыць работу самога ашчаднага апарату.**

Зразумела, што ад якасьці, выразнасьці работы ашчаднага апарату і належнага абслугоўваньня працоўных укладчыкаў у вялікай ступені залежыць далейшае разгортваньне ашчадспраны і аўтарытэт ашчадкас у вачох працоўных.

На вялікі жаль, прыходзіцца канстатаваць, што ня ўсюды ашчадны апарат знаходзіцца на вышыні пастаўленых перад ім задач.

Больш таго, мы маем выпадкі, калі нядбайная работа апарату падрывае аўтарытэт ашчадсправы, калі існуе безадказнасьць і недапушчальныя адносіны да работы.

Узяць, напрыклад, становішча і работу апарату **Віцебскай акруговай касы ашчаднасьці.** Становішча гэтага апарату і паводзіны працаўнікоў ня раз абмяркоўваліся партыйнай і камсамольскай ячэйкай.

Вось што апошняя на сваім пасяджэньні між іншым канстатавала:

— Загадчык аддзяленьня акруговай ашчадкасы **т. Смольскі** (член КП(б)Б) дэзарганізуе работу аддзяленьня, займаецца рвацтвам і г. д.

— З боку асобных камсамольцаў назіраецца няўважлівыя адносіны да работы, хвасьцём і бюракратычныя адносіны да наведвальнікаў.

— З боку намесьніка старшыні мясцкому ашчадкасы **т. Якаўлева** і эканомработнікаў мелі месца падхалімства, хвасьцём, садзейнасьць рвацтву і г. д.

— Адсутнасьць дысцыпліны ў работнікаў, ніякая кваліфікацыя і нежаданьне павышаць сваю кваліфікацыю.

Калі неадкладна ня будуць ужыты рашучыя меры да аздараўленьня работы апарату ашчадкасы, то такая важная справа, як мабілізацыя сродкаў насельніцтва ашчадкасамі ў Віцебскай акрузе, можа быць сарвана.

На цікавіцца гэтым пытаньнем і акраддзяленьне саюзу савецкіх і гандлёвых служачых.

Ёсьць і іншыя прыклады дрэннай работы ашчаднага апарату і ў іншых мясцох БССР.

Трэба ў пэрыяд «месячніка ашчаднасьці» ўзяць ашчадапарат пад шырокі грамадзкі кантроль з тым, каб аздаравіць, наладзіць яго работу.

Слова за камісіямі дапамогі дзяржкрэдыту і ашчадсправе, рабселькорамі і грамадзкасьцю.

А.

Ад добраахвотнага страхаваньня да абавязковага

На працягу амаль што васьмі год дзяржаўная і камунальная маемасьць страхавалася ў добраахвотным парадку. Кіраўнік прадпрыемства ці ўстановы сам вырашаў пытаньне, ці мэтазгодна страхаваць маемасьць, а калі мэтазгодна, то што іменна і ў якім разьмеры трэба страхаваць?

У выніку перш за ўсё страхаваліся аб'екты, небясьпечныя ў пажарных адносінах. Іншая маемасьць, калі і страхавалася, то не заўсёды ў поўным яе кошце. Але былі і такія выпадкі, калі гаспадарнік ня мог, па прычынах чыста аб'ектыўных, своячасова застрахаваць маемасьць.

Імкненьню гаспадарніка выбарачна страхаваць маемасьць, Дзяржстрах супроцьставіў сваю тарыфную палітыку. Яна заключалася ў падрабязнай надта складанай дыфэрэнцыяцыі тарыфных ставак. У сваю чаргу выбарачнае страхаваньне адбівалася на ўскладненьні тэхнікі вядзеньня справы і адлічасова на разьмерах накладных выдаткаў.

З 1-га кастрычніка мінулага году пастановай ЦВК і СНК БССР уведзена абавязковае страхаваньне маемасьці ад рамаджанага сэктару народнае гаспадаркі. Зьявілася маемасьць рашуча зьнішчыць старыя ўмовы і формы страхаваньня і пабудаваць іх на «усім новых пачатках.

У гэтай заметы мы абмяжуемся толькі самым галоўным—**аб'ёмам адказнасьці Дзяржстраху.** Адказнасьць наводле новых правіл усебакова, а іменна: «ад пажару, удару маланкі, усякага роду выбухаў, электрычнага току, паводкі, зямлятрасеньня, ліўняў, гураганаў, граду, галалёду, а таксама абвалаў і апоўзьняў, калі апошнія былі выкліканы стыхійнымі зьявамі». Далей, Дзяржстрах нясе адказнасьць за пакражы і страты маемасьці ў часе страхавога выпадку.

І нарэшце, на тых-жа правілах, Дзяржстрах адказвае за страты пры перавозках маемасьці па чыгунках, грунтавых і паветраных шляхох эносіл.

Такім чынам, замест абмежаванай адказнасьці па старых правілах, новыя прадугледзелі амаль усе тыя зьявы, якія могуць нанесьці эканамічныя страты застрахаванай маемасьці.

Д. СТАХЕЕЎ.

Суд над кулакамі—тэрарыстымі

Гэтымі днямі выязная сэсія Менскага акруговага суду, пад старшынствам тав. Мінкіна, пачала ў м. Бярэзіна разгляд справы аб забойстве беднака-актывістага **Раманенка.** Акалічнасьці гэтае справы наступныя.

Тав. Раманенка быў адным з актывістых-беднякоў, які рашуча змагаўся з кулацкімі элемэнтамі і цьвёрда абараняў усе мерапрыемствы савецкае ўлады. Кулацтва ненавідзела тав. Раманенка, бо ён заўсёды выступаў супроць яго. Асабліва ненавідзелі Раманенка кулакі **Гушча і Мартыненка.** Гушча — былы абшарнік, які да рэвалюцыі меў 240 дзесяцін зямлі. Зараз Гушча плаціць 900 р. падатку і абкладзены індывідуальна. Мартыненка таксама кулак, мае сваю ўласную маслабойку і заможную гаспадарку. Мартыненка вёў цесную дружбу з Гушчай. Абодвы вялі актыўную агітацыю супроць мерапрыемстваў савецкае ўлады, супроць самаабкладаньня, збожжазагатовак і інш. кампаній.

18-га лістапада 1929 году па сходзе аб самаабкладаньні і загатоўцы бульбы бядняк Раманенка ўнёс прапанову абкласьці Мартыненка па 50 пуд. бульбы. Раманенка матываваў сваю прапанову тым, што Мартыненка ўвесну 1929 году прадаў 500 пудоў бульбы на спэкуляцыйных цэнах. Прапанова была аднагалосна прынята. З гэта часу Мартыненка парашыў расправіцца з Раманенка. 25-га лістапада да Мартыненкі прышоў кулак Гушча і разам з ім абмеркаваў плян забойства актывістага.

У тую-ж ноч Мартыненка падкраўся да хаты Раманенкі і стрэлам праз вакно з паляўнічай стрэльбы забіў яго. Потым, каб схаваць сьляды, ён пабіў шыбы ў вокнах сваёй хаты і заявіў у сельсавет аб тым, што нібы па яго нехта рабіў замах, што нейкія невядомыя стралялі па яго хаце.

Аб намеры Мартыненка і Гушчы ведала жонка Мартыненка Надзея.

Гушча і Мартыненка прыцягнуты да адказнасьці па 70 арт. КК, Мартыненка Надзея — па 73 арт. КК. Па справе выклікана 11 сьведак.

С. Г.

Налёт на прыватныя крамы

На 300-400% даражэй, чым у каапэрацыі

Гэтымі днямі акргандаль і брыгады па праверцы прыватнага сэктару пры ўдзеле членаў гарсавету зрабілі налёт на прыватныя крамы г. Менску.

Налёт выявіў антысанітарны стан прыватных крам, скуралупства, недаважваньне і г. д.

Так, у краме прыватніка **Кугеля** прадаецца сыр і масла ні ў якім разе нягодныя для спажываньня. За 200 грам масла гандляр Кугель бярэ 1 р. 70 кап., прычым масла загорнута ў брудную анучу? Прыватнік **Гарэлік** (Савецкая, 185) бярэ за 100 грам масла 75 кап., прычым масла горкае. Гарэлік прадае кілё фасолі за 1 р. 10 кап., крупы пярловыя—70 кап. (у каапэрацыі—20 кап.). Гандляр **Каган** (Савецкая, 55) прадае па 22 кап. адно яечка. Крама знаходзіцца ў антысанітарным становішчы.

Прыватнікі **Аранчыкіна і Голуб** прадаюць просты жытні хлеб па 32 кап. кілё.

У 100 грамах масла, якое куплена ў прыватніка **Футэрмана,** аказаўся недахват 11 грам.

Гандлярка **Рытэнбанд** (Ніжні рынак) прадае кілё цьвікоў па 2 руб. у той час, калі ў каапэрацыі гэтыя цьвікі каштуюць 28 кап.

Вынікі налёту перададзены сьледчым органам.

Зьняты з работы ў БДУ

Праўленьне БДУ пастанавіла зьняць з работы ў БДУ дацэнтаў Пэўзнэра, Раўрэбе і Гольдбэрга, якія скажалі ў сваіх лекцыях марксысцкія погляды і праводзілі шкодную ідэалёгію.

МЦРК зварачае мала ўвагі на рабочыя акраіны

Дэфіцытныя галянтарэйныя тавары не трапляюць у акраінныя крамы

У апошнія два гады МЦРК шырока разьвіў гандаль галянтарэйна-трыкатажнымі таварамі. Зварот у гэтым годзе, параўнальна з 1927-28 г., узрос на 224 проц. Добра разьвіта сетка магазынаў, што гандлююць галянтарэйна-трыкатажнымі таварамі; сетка павялічылася да 25 адзінак. Прыватнік зусім зьнік з гэтага рынку, удзельная вага апошняга дасягае 1-3 проц.

Аднак, у рабоце ЦРК па забесьпячэньні найшчыкаў галянтарэйнымі таварамі ёсьць рад істотных дэфектаў.

Большасьць галянтарэйных магазынаў знаходзіцца ў цэнтры гораду, на акраінах няма ні універмагаў, ні спэцыяльных магазынаў, гандлюючых галянтарэйна-трыкатажнымі таварамі, рабочаму спажыўцу па кожную драбніцу прыходзіцца накіроўвацца ў цэнтр.

Усе дэфіцытныя тавары разьмяркоўваюцца паміж магазынамі па каэфіцыэнту; **з прычыны нізкіх зваротаў акраінных магазынаў асноўная маса дэфіцытных тавараў трапляе ў цэнтральныя магазыны. Назіраецца вялікі рознабой у цэнах—адна і тая-ж самая пара панчох і шкарпэтак прадаецца на 10-20 кап. даражэй у адным магазыне, чым у другім.**

Ня рэдкія выпадкі продажу бракаванага тавару па нармальных цэнах. У радзе магазынаў кепска абсталяваны выстаўкі і вітрыны.

Назіраецца вялікі недахват кваліфікаваных работнікаў, пераважна прадаўцоў на 50-60 проц.

Вывучэньне попыту пакупца вядзецца невыстарчальна.

«Усё робіцца на вока».

Слаба разьвіты гандаль цацкамі, музычнымі і спартыўнымі прыладамі.

Якасьць тавараў вельмі нездавальняючая. Склад МЦРК на якасьць тавараў пры прыёме іх зварачае надзвычайна мала ўвагі.

Для зьнішчэньня гэтых недахопаў трэба ўжыць наступныя меры для паляншэньня гандлю галянтарэйна-трыкатажнымі таварамі.

— Адкрыць два універмагі ў рабочых акраінах, адзін на Ляхаўцы і адзін на Камароўцы, таксама ў рабочых раёнах адкрыць спэцыяльныя галянтарэйна-трыкатажныя аддзяленьні пры вымешаных магазынах.

— Узмацніць забесьпячэньне дэфіцытнымі таварамі рабочых раёнаў, незалежна ад каэфіцыэнту звароту магазыну.

— Для сыстэматычнага назіраньня за цэнамі абавязаць усіх загадчыкаў магазынамі вывесіць прэйс-куранты з паказаньнем цэн на ўсе тавары.

— Арганізаваць спэцыяльны магазын продажу бракаваных тавараў мясцовай прамысловасьці, у мэтах барацьбы з продажам дэфіцытнага тавару па нармальных цэнах.

— Узмацніць выстаўкі і вітрыны ва ўсіх магазынах, якія гандлююць галянтарэйна-трыкатажнымі таварамі.

— Адкрыць два спэцыяльныя магазыны для гандлю аптэчнымі і парфумнымі таварамі.

— Ужыць тэрміновыя меры па паляншэньні якасьці галянтарэйна-трыкатажных тавараў, усклаўшы пэрсанальную адказнасьць за якасьць на загадчыка базы МЦРК.

С. Л. ТАЛАЧЫНСКАЯ.
(упоўнаважаны Цэнтрасаюзу).

Абмен хлебных кніжак

З 5-га лютага па 1-га сакавіка МЦРК будзе абменьваць хлебныя кніжкі. Кніжкі абменьваюцца ў аддзяленьнях міліцыі і жактах. Пры абмене трэба прадставіць дамаву кнігу, каапэрацыйную і хлебную кніжку і спраўку аб зарплаце.

15.000 новых ударнікаў

Трэба адзначыць, як непармальнае зьявішча, тое, што нашы прафсаюзы не наладзілі падліку ленінскага набору ўдарнікаў. Але, па думцы, адказнага сакратара ЦСПСБ тав. Аверына, ленінскі набор ударнікаў ужо даў прыблізна каля 15.000 новых ударнікаў, г. зн. павялічыў ранейшую колькасьць ударнікаў **у два разы.** Зараз агульная колькасьць ударнікаў па Беларусі складае прыблізна каля 300.000 чал. (54,5 проц. усяго прамысловага пралетарыяту).

У Акадэміі Навук

— У хуткім часе ў Ленінград выяжджаюць прадстаўнікі Беларускай і Украінскай Акадэміі Навук для канчатковага заключэньня і падпісаньня дагавору аб сацспаборніцтве паміж Акадэміямі Навук СССР, Беларускай і Украінскай.

— У сярэдзіне гэтага месяца ў Аршанскую і Віцебскую акругі выяжджаюць дзьве экспэдыцыі геалёгічнага інстытуту БАН для вывучэньня вапнаваньня глебы.

— БАН прыняла шэфства над палітычнымі вызволенымі Беластоцкае турмы.

МЕНСК

Каштоўнасьці—у фонд індустрыялізацыі

Паводле вестак Бел канторы Дзяржбанку, у фонд індустрыялізацыі краю паступіла звыш 43 кілё каштоўных рэчаў—золата, серабра і пэрлаў.

Асаблівую ініцыятыву ў здачы каштоўнасьцяй праявілі жонкі рабочых і служачых.

Хатнія гаспадыні, якія жывуць у жантаўскіх дамох, здалі 1 кілё залатых рэчаў, 18 грам пэрлаў і 30 кілё серабра.

Акрамя каштоўных рэчаў, наглядаецца здача працоўнымі аблігацый дзяржпазык у фонд індустрыялізацыі.

Рабочыя-палякі патрабуюць перадачы касьцёлу пад клуб

Менская акруговая канфэрэнцыя рабочых-палякаў пастанавіла ўзьняць хадайніцтва перад гарсаветам аб перадачы будынку касьцёлу па Савецкай вул. пад клюб.

Канфэрэнцыя пастанавіла распачаць збор сродкаў на набыцьцё клюбнага абсталяваньня. Дэлегаты тут-жа, на канфэрэнцыі, сабралі на гэтую мэту каля 50 руб.

Бесьперапынны навучальны год у БДУ

Праўленьне БДУ пастанавіла ўвесьці ў БДУ з наступнага акадэмічнага году бесьперапынны навучальны год.

Увесь навучальны год складаецца з 3-х трымэстраў, па 4 месяцы ў кожным. Кожны трымэстр будзе мець пры 5-дзённым рабочым тыдні 10 дэкад рабочых дзён і 2 дэкады перапынку.

Навіны МЦРК

Выдача цукру

З учарайшага дня МЦРК пачаў выдачу цукру найшчыкам за люты. 1-ая катэгорыя атрымае па 1 клгр. на едака, 2-ая катэгорыя—па 500 грам, 3-ая па—250 грам на едака. Па дзіцячых кніжках будзе выдавацца 250 грам.

Да **1-ае катэгорыі** належаць рабочыя прадпрыемстваў і асобы фізычнае працы (рабочыя заводаў, вылучэнцы, камсклад, курсанты ЦПШ'у, шофэры, вагонаважатыя, міліцыянэры, санітаркі, афіцыянты, прыбіральшчыцы і інш.). Да **2-ое катэгорыі**—сем'і рабочых і вайсковых служачых, служачыя і іх сем'і, інваліды працы і грамадзянскай вайны, саматужнікі каапэрацыйных арцеляй і іх сем'і, студэнты, лістаносцы, хатнія работніцы і інш.

Да **3-е катэгорыі**—саматужнікі-адзіночкі.

Хроніка трохмесячніка беларускай і нацменаўскай пралетарскай культуры

Спатканьне пісьменьнікаў з бібліятэчнымі работнікамі

Паводле ініцыятывы камсамольскай ячэйкі Працасьветы, гэтымі днямі ў доме асьветы быў наладжаны вечар спатканьня беларускіх пісьменьнікаў з бібліятэчнымі работнікамі. Галоўная ўвага была зьвернута на прасоўваньне беларускае літаратуры ў масы і на якасьць літаратурнае прадукцыі. Зачытваліся творы пісьменьнікаў і тутжа, на вечары, давалася ім ацэнка. Вырашылі часьцей наладжваць такія спатканьні з чытачамі, а таксама паноўніць бібліятэкі беларускай літаратурай і літаратурай нацменшасьцяй.

* * *

Ячэйка ЛКСМБ Працасьветы зрабіла дэталёвы агляд працы дзяржаўнай і камвузаўскай бібліятэк. Таксама быў зроблены налёт на 4 клюбныя бібліятэкі. Мэта налёту: выявіць колькасьць і якасьць беларускай і нацменаўскай літаратуры.

ПА АРШАНШЧЫНЕ
Дапамога пачынаючым пісьменьнікам

У Воршы мяркуецца арганізаваць літаратурныя гурткі пачынаючых пісьменьнікаў і прымацаваць іх да літаратурных арганізацый.

* * *

Арганізуецца конкурс на лепшую бібліятэку - перасоўку і на лепшы раён па распаўсюджаньні беларускае пралетарскае літаратуры.

* * *

Гаррайком за тэрмін 3-хмесячніка арганізуе 25 радыя-гурткоў і дыспут аб радыявяшчаньні. Арганізуюцца 150 ліквпунктаў для навучаньня ў індывідуальным парадку 1.000 камсамольцаў.

Мітынг-пераклічка

24-га студзеня ў Воршы быў скліканы мітынг - пераклічка агульна - гарадзкога раёну, на якім абмеркавалі плян удзелу кожнай арганізацыі ў трохмесячніку. Зроблена інфармацыя аб канкрэтнай работе.

* * *

ПА ПОЛАЧЧЫНЕ

Складзены 10 брыгад са студэнтаў пэдтэхнікуму і прафтэхшколы для паездкі на раёны для правядзеньня трохмесячніка.

Раёны суцэльнае граматнасьці

У Дрысенскай і Ветрынскай арганізацыях пастанавілі ліквідаваць няпісьменнасьць сярод усяго насельніцтва. РК і ячэйкі арганізуюць сходы няпісьменных з тым, каб няпісьменныя самі абавязалі сабе ліквідаваць няпісьменнасьць.

* * *

За час трохмесячніка мяркуецца арганізаваць пры кожным калгасе чырвоныя куткі і бібліятэчкі.

ПА МАГІЛЕЎШЧЫНЕ

У Магілеве для правядзеньня трохмесячніка ў вёскі пасланы тры брыгады, па 10-15 чал. камсамольцаў - студэнтаў з пэдтэхнікуму, пэдтэхнікуму і інш. (45 чал.). Запрапанавана райкомам і гаррайкому вылучыць брыгады для праверкі беларусізацыі.

У пачатку сакавіка месяца будзе праведзены палітбой паміж ячэйкамі і раённымі арганізацыямі. Пераможцы атрымаюць прэміі — трактары і інш.

* * *

ПА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ

У Залінейным раёне падрыхтоўваецца дыспут аб кніжцы Зарецкага «Падарожжа на новую землю». Нядаўна адбыўся вечар, спэцыяльна прысьвечаны 3-хмесячніку. Была пушчана па раёне кніжная эстафэта.

Сацспаборніцтва на лепшае правядзеньне трохмесячніка

Залінейны раён выклікаў гарадзкі раён на сацспаборніцтва спэцыяльна па 3-хмесячніку.

* * *

БДТ-1 гэтымі днямі паладзіў спэцыяльны вечар, прысьвечаны 3-хмесячніку беларускае пралетарскае культуры і культуры нацменшасьцяй. Дырэктар БДТ-1 Сэлях зрабіў даклад. Была дана пастаноўка.

— Гэтымі днямі БДТ-1 наладжвае ў Залінейным раёне другі такі-ж вечар.

У Добрушы—трансьляцыйная радыё-станцыя

20-га сьнежня ў Добрушы адкрылася трансьляцыйная радыя-станцыя, якая будзе абслугоўваць 2.000 кватэр рабочых гучна-гаварыцелямі. Ужо ўстаноўлены 80 гучна - гаварыцеляў. 21-га сьнежня была наладжана першая вопытная перадача радыя-газэты. Перадача прайшла вельмі добра.

На ліквбезным фронце дрэнна

На лесазаводзе «Калектыўная Праца» да гэтага часу не арганізавана ячэйка т-ва «П. Н.» і не пастаўлена належным чынам справа ліквідацыі няпісьменнасьці. Заводзкі камітэт няўважліва адносіцца да гэтае справы. Бязумоўна, што пры такіх адносінах з боку заўкому, ліквідацыя няпісьменнасьці на заводзе ў занепадзе. У горадзе да гэтага часу не арганізаваны вячэрнія пакоі для дзяцей няпісьменных работніц, каб апошнія мелі магчымасьць наведваць ліквпункты. Прафарганізацыі не зварачаюць на гэта ўвагі. У некаторых вёсках Рачыцкага і Ўваравіцкага раёнаў зрываюцца запяткі ліквпунктаў з тае прычыны, што мясцовыя спажывецкія таварыствы не забясьпечылі ліквпункты газаю для асьвятленьня.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЕНЬНЯ

Дом Камасьветы. А 7-й гадз. увеч., у пакоі № 19, адбудзецца калектыўная кансультацыя Наркамзему—«Аб пасеўнай кампаніі і калектывізацыі». Уваход па партыйных і камсамольскіх білетах.

Курсы рацыяналізатараў пры «Аргбудзе». Вызначаны цьвёрды расклад заняткаў у наступныя чыслы месяца: 3, 5, 8, 10, 13, 15, 18, 20, 23, 25, 28 і 30—а 6-й гадз. увеч. Слухачы павінны зьяўляцца абавязкова.

Кастрычніцкі РК КП(б)Б. А 7-й гадз. увеч., у памяшканьні РК, адбудзецца дэлегацкі сход 2-е групы пры РК.

Дом Працасьветы. А 7-й гадз. адбудзецца вечар абмеркаваньня працы акруговай пракуратуры. Будзе кіно.

— Перарэгістрацыя членаў Дому будзе праводзіцца да 10-га лютага. Неперарэгістраваныя будуць лічыцца выбыўшымі.

НК-РСІ БССР склікае сёньня агульны сход рацыяналізатараў савецкіх устаноў г. Менску. Будзе заслуханы даклад члена калегіі НК-РСІ т. Ракава аб «мэтадзе і выніках рэарганізацыі Віцебскае акругі ў вопытна-паказальную». Пачатак роўна а 6½ гадз. увеч. у памяшканьні НК-РСІ (заля пасяджэньняў). Запрашаюцца рабочыя і служачыя.

ЗАЎТРА

Менскае мэдычнае таварыства. А 9-й гадз. веч., у клюбе «Мэдпрацаўнік», адбудзецца 27-е пасяджэньне. На парадку дня—дэманстраваньне хворых, «аб алавяным атручваньні рабочых - ганчароў» (д-ры Флекель і Чарноў) і «тэрапэўтычны ўплыў эсэнтукскіх мінэральных вод» (д-ры Васёўскі і Ліпец).

Вячэрняя саўпартшкола. Усе выкладчыкі палітэканоміі 1-га курсу і эканомпалітыкі 2-га курсу могуць атрымаць 4-га і 5-га лютага падручнікі «Палітэканомію» Ланідус і Астравіцян, «Эканомпалітыку» Сэгаль і Таль—новы выпуск у АК КП(б)Б, у АП (у т. Радчука).

Дом Камасьветы. Пры Доме камасьветы штодня ад 5 да 10 гадз. веч., у пакоі № 23 (уваход з вул. Энгельса), праводзіцца кансультацыя т. т. Любіна і Фліса па бягучай палітыцы і мэтадах прапаганды і агітацыі.

Вячэрняя саўпартшкола. 9-га лютага а 7-й гадз. веч., у памяшканьні Дому Камасьветы, адбудзецца лекцыя дня. Усе ВСПШ—«Уводзіны ў палітэканомію». Яўка ўсіх слухачоў першага курсу ВСПШ абавязкова. Пажадана, каб прыйшлі слухачы 2-га курсу.

П.-к. «Паліграф». 2-га лютага ў памяшканьні п.-к. «Паліграф» пачалася праверка ячэйкі КП(б)Б «Паліграф».

Менская АКК КП(б)Б просіць зьявіцца на пасяджэньне прэзыдыуму для разбору партыйных спраў 4 лютага 1930 г., а 10 гадз. раніцы, у памяшканьне канцылярыі АКК (Энгэльса, 28) наступных т. т. Шавель А. А. (яч. яўпэдтэхнікуму), Чарняўскі, Я. Я. (яч. яўпэдтэхнікуму) Ліманскі К. М. (яч. пажарнае каманды), Давідовіч С. (яч. Белсампраксаюзу), Маргенштэйн Б. Я., Баўдзей А. В., Смольскі С. А. Файвэр Г. М., Гаршковіч Р. М., Данцыгер Р. Р., Розэнбэрг, Султан І. Ш. (яч. ЦРК), Махнач Г. Ф. (яч. Белсампраксаюзу), Крэйнін (яч. БАН), Калодніч Я. С., Луцкевіч В. В. (яч. Белпайгандаль), Шалыгін А. Р. (яч. Бел. палка ДПУ), Трыбушэўскі (яч. гарсаўгасу).

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

КІНО-ТЕАТР КУЛЬТУРА
Звыш праграмы гастроль лепшых сатырыкаў
ГРОМАВА І МІЛІЧА
З прычыны ёлікага посьпеху 2-гі тыдзень мастацкі фільм
ГАЛУБЫ ЭКСПРЭС
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. Каса ад 5 г.

КІНО Рэтэрацыйна
Намецкі фільм вытворчасьці Уфа-фільм 1929 г.
2-гі тыдзень пастаноўкі
ВІНАВАТЫ (судовая памылка).
У галоўн. ролі БЭРНАРД ГЭТЦКЕ.
Пачатак 1 сэансу а 7 гадз. увеч
Каса адчынена ад 5 гадз.

КІНО Пралетарый
2-гі тыдзень 2-гі тыдзень
Новы амэрыканскі фільм.
МОАНА (СЫН ПАЎДНЁВЫХ МАРЭЙ)
у 7 част.
— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ —
кіно-хроніка Сазкіно № 80
Пачатак роўна а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз

1-шы яўрэйскі кіно-тэатр „Юны Піянэр"
М-стацкі фільм
ПАЛОНЬНІКІ МОРА
у 7 частках.
Звыш праграмы— навуковы фільм
КАЛМЫКІ у 1 ч.
Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—3 г. 30 м.
Каса адчынена ад 12 гадз. дня.

КІНО СпартаК
Выдатны мастацкі баявік
ВЯСЕЛАЯ КАНАРЭЙКА
Пачатак 1-га сэансу—а 6 г. 30 м. і а 5 гадз.

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР
З. ТОЛЬЛЕР.
Аўторак, 4 лютага для фабкому 1-й друкарні. Білеты ў фабкоме.
ГОП-ЛЯ, ЖЫВЕМ

СЛУХАЙЦЕ — РАДЫЁ — МЕНСК
6, 13, 18, 21 і 27 лютага ад 8—9 гадз. увечары будзе прачытан
КУРС РАБОЧАЙ КААПЭРАЦЫІ.
Бел. радыё-унівэрсытэт. Культадзел БКС.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАЯ ЯЎРЭЙСКАЯ — МАДЫЧНА-САНІТАРНАЯ Т-ВА
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Савэтаў, тэл. 12-66
АДКРЫТА ад 9 га 3. дня. да 9 г. увеч.
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:
па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вокачных, хваробах вуха, горла і носа, скурна-венэрычных, страўніцкіх, нервовых.
Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыт з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г. 30 м. да 9 г. увеч.
Прыём хэміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.
Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на дому па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.
Дзяжурства дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Начное дзяжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз. раніцы.
Прыём хворых па лекавых кніжках Таварыства.
Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную дыфэрэнцыяваную плату.

Прэзыдыум Цэнтральнага Праўленьня саюзу будаўнікоў і Рэспубліканскае Бюро ІТС будаўнікоў
ДАВОДЗЯЦЬ да ведама ўсіх членаў саюзу, што з 5-га па 10-га лютага ўключна
АДКРЫТА ВЫСТАЎКА
паступіўшых праектаў пабудовы клюбу будаўнікоў у Менску.
ВЫСТАЎКА ПРАЕКТАЎ—У ПАМЯШКАНЬНІ КЛЮБУ «ЧЫРВОНЫ БУДАЎНІК» (вул. Энгельса, 13, 2-гі паверх, Ленкуток) штодзенна з 10—2 гадзін дня і з 5—10 г. увеч.

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва
Менск, Савецкая, 63.
Вышла з друку, паступіла ў продаж і рассылаецца падпісчыкам
„ПОЛЫМЯ"
Беларуская часопісь літаратуры, палітыкі, эканомікі, гісторыі, крытыкі
№ 11-12 за лістапад-сьнежань 1929 № 11-12
ЗЬМЕСТ:
Янка Купала. Сыходзіш вёска з лясной яны. Верш.
Я. Нёманскі. Драпежнікі. Роман у трох частках (працяг).
Яўб Колас. На шляхох волі. Поэма (працяг).
Л. Родзевіч. Дайшоў свайго. Апавяданьне.
Алесь Звонак. Каршун. Поэма.
Сымон Баранаў. Мены. Апавесьць (канец першай часткі).
Ізраіль Гіладзік. З лягернага блёк-ноту.—1. На варце. 2. Трывога. Вершы.
М. Хведаровіч. Чорны. Верш.
Сергей Фамін. * * * Верш.
В. Сташэўскі. На сонечным шляху. Эскізы.
С. Беднарскі. Новая веха на пераможным шляху соц. будаўніцтва.
Observer. Актуальныя проблемы замежнай і ўнутраной палітыкі Латвіі за апошні год.
Проф. У Пічэта. Сялянскія рухі на Беларусі пасьля аграрнай рэформы 1861 г. (Канец).
С. Будзінскі. Ворагу доме.
П. Дарневіч. Да пытаньня аб проблеме мастацкага стылю.
ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА на 1930 год
Часопісь «ПОЛЫМЯ» выходзіць штомесяц—12 кніжак на год, намерам кожная ў 10—12 аркушаў.
У 1930 ГОДЗЕ ПАДПІСНАЯ ЦАНА ЗНІЖАН